ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

№ 261 (3369) Субота, 16 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ВАРШАВА, 15. У польскіх газэтах надрукавана інтэрв'ю начальніка ўсходняга аддзелу польскага мін. зам. спраў Галувкі пад інсьпіраваным загалоўкам «Мірная палітыка Польшчы і бальтыцкіх дзяржаў у адносінах да Савецкай Расіі». Інтэрв'ю пабудована так, што Галувка гаворыць на толькі ад імя бальтыцкіх дзяржаў. (Падрабязнасьці—у заўтрашнім нумары «Зьвязды»).

НАВІНЫ В. С. С. Р.

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу). Калектывізацыяй сельскай гаспадаркі ахоплены ўсе вілхія куткі Рагачоўшчыны. За апошні час на тэрыторыі 10 сельсаветаў створана 36 новых калгасаў з 3.573 гаспадаркамі, што складае 60 проц. усяе зямельнае плошчы гэтых сельсаветаў. Зараз вядзецца падрыхтоўчая праца да стварэньня ў Рагачоўскім раёне калгасу-гіганту.

ДА ЗЬЕЗДАЎ УДАРНЫХ БРЫГАД

5-га сьнежня ў Маскве адкрываецца ўсесаюзны зьезд ударных брыгад.

Да гэтага тэрміну на мясцох павінна быць прароблена вялікая работа. Трэба зрабіць агляд ударных брыгад, прыцягнуць да ўдзелу ў гэтым агляндзе шырокія масы рабочых, вывучыць кіраўніцтва брыгадамі з боку партыйных і прафсаюзных арганізацый, склікаць акруговыя зьезды ўдарнікаў. Падрыхтоўка да зьезду павінна быць скарыстана для наглядной прапаганды новых камуністычных мэтадаў работы, для ўзмацненьня брыгад і іх колькаснага росту.

Выявіць недахопы і хворыя бакі ўдарных брыгад, у кожным цэху арганізаваць вытворчыя брыгады, ад ударных брыгад перайсьці да ўдарных цэхаў, да ўдарных заводаў,—вось лёзунгі, пад якімі павінна праходзіць падрыхтоўка да зьезду.

Усесаюзны і беларускі саветы прафсыянальных саюзаў далі мясцом вычэрпваючыя і катэгарычныя дырэктывы аб правядзеньні падрыхтоўчай работы да акруговага і ўсесаюзнага зьезду.

Да зьезду засталося некалькі тыдняў. Часу мала. Аднак, мы павінны канстатаваць, што работа на мясцох ідзе павольна і нездавальняюча.

Так, з Гомелю паведамляюць, што ў Запінейным раёне з-за невыстарчэльнай падрыхтоўкі быў адкладзены раённы зьлёт ударных брыгад. У Нова-Беліцкім раёне нічога ня было зроблена для скліканьня зьлёту.

У Барысаве падрыхтоўка ідзе бюракратычным шляхам. Рабочыя да апошняга часу былі слаба інфармаваны аб надыходзячым зьезьдзе. На фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна», якая павінна паслаць дэлегата на ўсесаюзны зьезд, доўгі час не вялося ніякай растлумачальнай работы.

«Віцебскі Пралетары» адзначае, што на некаторых віцебскіх прадпрыемствах не даволі ўявілі важнае значэньне ўдарных брыгад. На сходах, на якіх заслухоўваюцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за мінулы год, аб брыгадах гавораць толькі мімаходам, выпадкова.

Такія бюракратычныя адносіны да падрыхтоўкі зьезду недапушчальны. Яны могуць ня толькі адмоўна адбіцца на пасьпяховасьці работ зьезду, але і на ўсім далейшым ходзе сацыялістычнага спаборніцтва.

Мясцовыя прафсыянальныя, камсамольскія арганізацыі і прэса павінны дабіцца безадкладнага паралому ў падрыхтоўцы да зьезду. Трэба разварушыць усю фабрычна-заводзкую грамадзкасьць, трэба мабілізаваць усю рабочую масу. Аб задачах зьезду павінен ведаць кожны рабочы.

Падрыхтоўку да зьезду скарыстаем для далейшага росту ўдарных брыгад, для большага разгортваньня сацспаборніцтва, для далейшага ўзмацненьня камуністычных форм арганізацыі працы. Партыйныя і прафсыянальныя арганізацыі павінны акружыць сваёй увагай усю падрыхтоўчую работу да зьезду.

ФРАНЦЫЯ ЗАЦЯГВАЕ ЭВАКУАЦЫЮ РЭЙНСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

Нямецкі пасол у Парыжы ў Брыяна

ПАРЫЖ, 13. У сувязі з наведаньнем прэм'ер-міністра Тардзье нямецкім паслом у Францыі фон-Гэшам, асьвядомленыя газэты падаюць, што хаця тэрмін скліканьня другой гаагскай канфэрэнцыі канчаткова і не ўстаноўлен, аднак, Тардзье, падобна Брыяну, запэўніў фон-Гэша, што эвакуацыя трэцяй зоны Рэйнскай вобласьці, нават у выпадку адтэрміноўкі другой гаагскай канфэрэнцыі, пачнецца неадкладна пасьля выкананьня Нямеччынай абавязацельстваў, прадугледжаных гаагскаю згодаю. Калі Нямеччына выканае свае абавязацельствы не пазьней першага сакавіка 1930 году, дык эвакуацыя 3-й зоны зможа закончыцца да 30-га ліпеня. (ТАСС).

БЭРЛІН, 12. Зварот нямецкага пасла ў Парыжы да Брыяна паказвае, наколькі ў Бэрліне **занепакоены** заявамі Тардзье адносна тэрмінаў канчатковай эвакуацыі Рэйнскай вобласьці. Аб зьместе гутаркі перадаецца толькі ў «Матэн», дзе паведамляецца, што Брыян і гэтым разам **унікаў станоўчых заяў.** Замест таго ён задаволіўся агульным запэўненьнем, што Францыя без патрэбы ніякім чынам не зацягне эвакуацыі. Таму становіцца ясным сэнс налягання Гэша аб хутчэйшым скліканьні гаагскай заключнай канфэрэнцыі і на прысьпяшэньні выкананьня ўсіх папярэдніх умоў да эвакуацыі.

Калі лічыць правільным паведамленьне «Матэн», што, на думцы Брыяна, скліканьне гаагскай канфэрэнцыі да канчатковага высьвятленьня лёсу патрабаваньня правых аб назначэньні рэфэрэндуму на плябіст Юнга «антыдэмакратычна», дык ня відно, як можна будзе склікаць канфэрэнцыю **яшчэ ў гэтым годзе.** Справа ў тым, што пытаньне аб рэфэрэндуме можа быць канчаткова вырашана не раней 15-га сьнежня. («Известия»).

ПАРЫЖ, 11. У спрэчках па замежнай палітыцы, якія праходзілі ў палаце дэпутатаў, было закранута таксама пытаньне аб Саарскай вобласьці. Пункт погляду правых партый быў выказаны Тэттэнжэ. Ён даводзіў, што перагаворы з Нямеччынай, якія мяркуюцца, зьяўляюцца **«заўчаснымі»;** заўчасным быў бы таксама і датэрміновы выкуп саарскіх вугальных капалень Нямеччынай. (Па Вэрсальскім дагаворы Нямеччына можа выкупіць саарскія вугальныя капальні, калі насельніцтва Саарскай вобласьці выкажацца шляхам плебісциту за злучэньне вобласьці з Нямеччынай; плебісцыт павінен быць праведзены ў 1935 годзе).

Паводле думкі Тэттэнжэ, да 1935 году ўзрасьце, па першае, цана капальняў, а па другое, эканамічны і палітычны ўплыў Францыі ў Саарскай вобласьці, калі да 1935 г. у вобласьці будзе захоўвацца цяперашні парадак кіраўніцтва, дык «можна епадзявацца, што хаця-б некаторыя раёны Саарскай вобласьці, найбольш цесна зьвязаныя з прамысловасьцю Лётарынгіі, выкажуцца супроць злучэньня з Нямеччынай; таму, адкладаючы перагаворы, Францыя зможа ў будучым дабіцца больш выгадных умоў выкупу капальняў Нямеччынай, а таксама атрымаць рад мытных прывілей і забясьпечыць сабе ўдзел у саарскай вугальнай прамысловасьці».

Адказваючы Тэттэнжэ, Брыян заявіў, што на перагаворах ня будзе абгаворвацца пытаньне аб зьмене цяперашняга парадку кіраўніцтва Саарскай вобласьцю (г. зн. аб аднаўленьні нямецкага сувэрэнітэту ў гэтай вобласьці). Аднак, па думцы Брыяна, адтэрміноўка перагавораў аб выкупе капальняў да 1935 году нявыгадна для Францыі, бо ў выпадку пасьпяховага для Нямеччыны выніку плебісциту, выкупная цана капалень будзе акрэслена не францускай-нямецкаю згодаю, а шляхам міжнароднага арбітражу. Таксама для Францыі больш выгадна **ўжо зараз** дагаварыцца з Нямеччынай і аб іншых умовах. Пры дапамозе гэтых перагавораў Брыян разьлічвае **«забясьпечыць у Саарскай вобласьці рэжым француска-нямецкага эканамічнага супрацоўніцтва** на доўгі тэрмін»; гэта супрацоўніцтва, па словах Брыяна, павінна пашырацца на вугальную прамысловасьць і мэталюргію, а таксама выяўляцца ў наданьні Францыі раду мытных ільгот.

Правыя здаволіліся гэтымі заявамі, а радыкалы і сацыялісты не супярэчылі супроць іх. (ТАСС).

Італія арганізоўвае фашысцкі „Інтэрнацыянал"

БЭРЛІН, 13. Левая рабочая газэта «Вэльт ам Абэнд» зьмясьціла пад загалоўкам «Чужаземны батальён Мусаліні» паведамленьне аб пастанове дырэкторыі фашысцкай партыі Італіі стварыць міжнародную фашысцкую арганізацыю «Прыхільнікаў фашызму». Арганізацыя гэта ствараецца выключна для чужаземцаў, «спачуваючых фашысцкаму руху і фашысцкаму ладу».

У італьянскай фашысцкай газэце «Фоліе Ардыні» апублікован адпаведны дэкрэт. У адным з пунктаў гэтага дэкрэту гаворыцца, што членамі міжнароднай арганізацыі «прыхільнікаў фашызму» могуць быць усе спачуваючыя фашызму чужаземцы, незалежна ад таго, ці жывуць яны ў Італіі, ці заграніцай. Характэрным зьяўляецца пункт 5, у якім гаворыцца, што **хадайніцтва аб прыёме ў гэту арганізацыю разглядаецца генэральным сакратарыятам фашысцкай партыі толькі пасьля разгляду іх італьянскім консульствам у краі, дзе знаходзіцца кандыдат.**

Рэдакцыя «Вэльт ам Абэнд» зазначае, што гэта першы выпадак, калі прадстаўніком замежнай дзяржавы даручаецца весьці арганізацыйную работу сярод падданых дзяржавы, пры якім яны акрэдытаваны.

Амэрыканская рабочая дэлегацыя ў Менску

Падрыхтоўка імпэрыялістых да новай камэдыі па „разбраеньні"

У Лёндане абмяркоўваецца плян „Міжземнага Лёкарно"

ЛЁНДАН, 14. Жэнэўскі карэспандэнт урадавай «Дэйлі Гэральд» паведаміў учора, што Францыя і Італія могуць згадзіцца на ўстанаўленьне роўнасьці паміж флётамі міжземных дзяржаў, калі Англія возьме на сябе абавязак выступіць са сваім флётам супроць нападаючай дзяржавы ў выпадку вайны паміж Італіяй і Францыяй.

Дыплёматычны карэспандэнт кансэрватыўнай газэты «Дэйлі Тэлеграф» самым катэгарычным чынам абвяргае сьцьвярджэньне «Дэйлі Гэральд» аб тым, што ў Лёндане абмяркоўваецца плян «Міжземнага Лёкарно».

Францыя баіцца ізаляцыі на морскай канфэрэнцыі

ПАРЫЖ, 12. Францускія газэты б'юць трывогу па поваду стварыўшагася становішча ў пытаньні аб марскіх разбраеньнях. Газэты адзначаюць, што ўзрастаючая дагаворанасьць па пытаньнях марскога разбраеньня паміж Англіяй і ПАЗШ, мяркуемае зблiжэньне з імі Японіі і, урэшце, узрастаючыя шансы на пераход у Ангельска-Саксонскі лягер Італіі ствараюць для Францыі пагрозу поўнай ізаляцыі на надыходзячай канфэрэнцыі па пытаньнях аб марскім разбраеньні.

Газэты настойліва патрабуюць ад французкага ўраду пільнай дыплёматычнай падрыхтоўкі да канфэрэнцыі і падкрэсьліваюць неабходнасьць супрацідзейнічаць пробам англа-саксаў падкупіць Японію і Італію дачаю ім буйных пазык. Газэты патрабуюць, каб францускі ўрад цьвёрда абараняў правы Францыі на пабудову падводных лодак і не сяромяўся пэрспэктывы зрыву канфэрэнцыі.

Як „рабочы" урад маскуе ўзбраеньні

ТОКІЁ, 14. Паводле вестак «Сімбун Рэнго» з Лёндану брытанскі марскі міністар заявіў, што работы па пабудове марское базы ў Сінгапуры спынены.

Прадстаўнікі японскіх марскіх колаў, у гутарцы з прадстаўнікамі друку адзначылі, што ня могуць зразумець гэтага паведамленьня, бо ў сапраўднасьці пабудова базы ня спынялася і ў Сінгапуры толькі што скончаны важныя работы па пабудове ўмацаваньняў. Заява брытанскага марскога міністра ацэньваецца ў марскіх колах, як **манэўр у сувязі з надыходзячай канфэрэнцыяй па марскім разбраеньні.**

Японія дамагаецца павялічэньня свайго флёту

ТОКІЁ, 14. Уся вячэрняя проса друкуе паведамленьне аб тым, што **паміж прадстаўнікамі марскога міністэрства і міністэрства замежных спраў адбылася важная нарада, на якой было пастаноўлена ва што-б там ні стала дабівацца ўстанаўленьня прапорцыі марскіх узбраеньняў 10:7.**

Як падае агэнцтва «Сімбун Рэнго» Макданальд заявіў, што ангельскі ўрад не жадае абгаварваць у папярэдніх перагаворах пытаньня, якое высоўвецца Японіяй, аб прапорцыі марскіх узбраеньняў і прапануе гэта пытаньне абгаварыць на мяркуемай студзеньскай канфэрэнцыі марскіх дзяржаў.

Вялікія манэўры ў Японіі

ТОКІЁ, 14. 15-га лістапада ў прафэктуры Ібаракі і Цыба начнуцца вялікія манэўры ў прысутнасьці імпэратара. У манэўрах прымуць удзел тры дывізіі ў складзе 50 тыс. салдат, а таксама 120 самалётаў. Манэўры прадугледжваюць выпрабаваньне сыстэмы кантролю ваенных дзеяньняў шляхам радыё-сувязі паміж самалётамі і штабам, а таксама пробную мабілізацыю грамадзянскага насельніцтва—членаў гурткоў моладзі, студэнтаў і былых салдат.

Амэрыка патрабуе свабоды мораў

«МІРАЛЮБСТВА» БЕЗ УСЯКІХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

НЬЮ-ЁРК, 11. Як паведамляюць з Вашынгтону, Гувэр выступіў з прамоваю ў дзень гадавіны перамір'я 11 лістапада. У сваёй прамове Гувэр паказаў, што міжнароднае становішча зьяўляецца «адносна мірным», аднак, падкрэсьліў, што агульны лік армій ва ўсім сьвеце, уключаючы рэзэрвы, **складае 30 міл. чалавек, прыблізна на 10 міл. больш, чым да сусьветнай вайны.**

Гувэр паказаў, што імкненьне народаў да міру ўсё павялічваецца, аднак, паміж нацыямі існуюць супярэчнасьці і паміж ПАЗШ і іншымі дзяржавамі паўстаюць канфлікты, у сувязі з неабходнасьцю абараняць інтарэсы амэрыканскіх грамадзян у іншых дзяржавах. Акрамя таго, не ўрэгуляваны цэлы рад пагранічных канфліктаў і некаторыя народы імкнуцца атрымаць самакіраўніцтва.

Гувэр заявіў далей, што ён упэўнены ў посьпеху марское канфэрэнцыі вялікіх дзяржаў, якая адбудзецца ў студзені, і выказаў надзею, што ў выніку гэтае канфэрэнцыі будзе дасягнута скарачэньне марскіх узбраеньняў.

Адзначаючы жаданьне ПАЗШ зьменшыць свой марскі флёт, Гувэр сказаў: «Няхай іншыя нацыі выкажуцца, як далёка яны хочуць пайсьці ў гэтых адносінах. Ніякая прапорцыя ня будзе занадта малою для нас».

Закрануўшы пытаньне аб свабодзе марэй, Гувэр «неафіцыйна» дамагаўся прыстасаваньня прынцыпу вольнага плаваньня для параходаў, якія перавозяць харчы ў ваенны час, а таксама для шпіталёвых суднаў. «Калёсальная магутнасьць Злучаных Штатаў,—сказаў Гувэр,—палохае нацыі, якія баяцца сваю вольнасьць, бо іх абарона супроць нас можа мець толькі маральны характар».

У заключэньне прэзыдэнт заявіў, што ён наведаў Паўдзённую Амэрыку і вёў перагаворы з Макданальдам, з мэтаю дэманстраваць міралюбівыя імкненьні амэрыканскага ўраду, але падкрэсьліў, што ўрад ПАЗШ ня прыняў на сябе ніякіх абавязацельстваў.

Становішча Надыр-хана ўстойлівае

ЛЁНДАН, 14. Агенцтва «Рэйтэр» паведамляе з Пешэвару: «Становішча новага падышаха Аўганістану Надыр-хана цяпер устойлівае. Рэзыдэнцыя Надыр-хана знаходзіцца ў Кабульскай крэпасьці. Надыр-хан склікаў раду правадыроў аўганскіх пляменьняў. Ці запрапануе Надыр-хан радзе зацьвердзіць абвяшчэньне яго падышахам, пукуль што не вядома.

НАЗНАЧЭНЬНЕ АЎГАНІСТАНСКАГА ПАСЛАНЬНІКА Ў МАСКВУ

МАСКВА, 15. Паводле атрыманых вестак, аўганістанскім паслом у Маскве назначаецца сэрдар Мухамэт Азіо-хан, Брат аўганскага падышаха Мухамэт Надыр-хана.

Паўнамоцны прадстаўнік у Афганістане т. Старк вярнуўся з водпуску ў Маскву і ў бліжэйшыя дні выязджае ў Кабул.

ПРЫЗНАНЬНЕ НАДЫР-ХАНА АНГЛІЯЙ

ЛЁНДАН, 15. Агенцтва Рэйтэр падае, што ангельскі ўрад прызнаў Надыр-хана кіраўніком Аўганістану пад імям Надыр-шаха.

Апошнія маскоўскія навіны

(Ад нашага карэспандэнта)

АСЬВЯЖЭНЬНЕ КААПЭРАЦЫЙНАГА АПАРАТУ

Масавы суботнік па разгрузцы бульбы, арганізаваны маскоўскім камсамолам, паказаў, што каапэрацыйны апарат, у паасобных сваіх зьвеньнях пратніў, засьмечаны бюракратычнымі элемэнтамі. **Таму,** як паведамілі нашаму карэспандэнту ў МРК, **назначаецца датэрміновая чыстка маскоўскай каапэрацыі. На адказныя пасады ў каапэрацыю будуць у працягу месяца назначаны 250 камсамольцаў-актывістых, якія праявілі сябе ў часе суботніку.**

ТЭАТРАЛЬНАЯ НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

У канцы лістапада ў Маскве склікаецца нарада прадстаўнікоў саюзных і аўтаномных рэспублік па пытаньнях нацыянальнага мастацтва, галоўным чынам, тэатру. У нарадзе прымуць удзел ня толькі Украіна, Беларусь, Грузія, Арменія, Татарыя, але і прадстаўнікі больш дробных і адсталых народнасьцяй. Будуць заслуханы даклады тав. Бубнова, Раскольнікава, Нікэля, а таксама даклады з месц.

НА ШТО ПАЙШЛА ПАЗЫКА МАССАВЕТУ

На грошы, сабраныя ў рахунак пазыкі Массавету, у Маскве ўжо закончана пабудова **адзінаццаці** вялікіх, дасканала абсталяваных школ. Праз месяц школы пачынаюць работу. **Яны ахопяць звыш 20.000 дзяцей рабочых.** З пабудоваю гэтых школ ліквідуецца крызіс са школьнымі памяшканьнямі, які моцна даваў сябе адчуваць у апошнія гады.

27-га лістапада экіпаж „Краіны Саветаў" ад'яжджае з Нью-Ёрку ў СССР

НЬЮ-ЁРК, 14. Экіпаж самалёту «Краіны

АЛЬБО, АЛЬБО...

Катастрафічнае банкруцтва правай апазыцыі і поўны правал усіх яе палітычных прагнозаў зьяўляецца агульна-прызнаным фактам для ўсёй партыі і для ўсяе рабочае клясы.

Хто з прыхільнікаў Бухарынскай групы адважыцца заявіць, што тэмп індустрыялізацыі, які намячаўся партыяй, не праводзіцца, або практычна зьяўляецца невыканальным, што з хлебазагатоўкамі ў гэтым годзе партыя правалілася, што калгасны і саўгасны сэктар яшчэ ў працягу многіх год ня будзе іграць вытворчую ролю ў збожжавай гаспадарцы краю, што сялянства ў калгасы ня пойдзе?.. Хто з прыхільнікаў бухарынскай апазыцыі адважыўся-б сьцьвярджаць аб гэтым на партыйным, або рабочым сходзе, калі вялізныя посьпехі партыі ў справе будаўніцтва сацыялізму, у труднейшай справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі прызнаны ўсім сьветам, калі аб іх паведамляюць штодзённа за граніцу карэспандэнты замежных буржуазных газэт, якія пражываюць у СССР? У выніку партыйны, або рабочы сход напэўна адаслалаў-бы такога чалавека... для безадкладнага агляду яго разумовых здольнасьцяй.

Пасьля поўнага правалу ўсіх прарокаў правай апазыцыі, партыя магла чакаць ад яе прадстаўнікоў агульнага прызнаньня сваіх памылак. Аднак, праводыры правай апазыцыі, як і іх бліжэйшыя ідэйныя паслугачы, да гэтага часу не заяўляюць аб прызнаньні памылковасьці сваёй лініі. Як можна меркаваць паводле пядаўніх выступленьняў Сьляпковых, Айхэнвальдаў, Зайцавых і інш. «навуковых людзей» бухарынскай «школы» і па іншых фактах мы маем справу толькі з некаторай зьменай тактыкі ў барацьбе супроць партыі.

Правая барацьба працягваецца. Правыя ўхілістыя ня хочуць здаваць сваіх ідэёвых пазыцый. Старыя абвінавачаньні партыі (ваенна-фэўдальная экспляататацыя сялянства, насаджэньне бюракратызму і г. д.) схаваны ў кішэню на час. Іх покуль больш не паўтараюць. Заяўляюць (нават некалькі з большым націскам, чым раней) аб згодзе з генэральнай лініяй партыі. Імі прызнаюцца нават вялізныя дасягненьні партыі за апошні час. Але ўсе мінулыя дакументы і дэкларацыі, антыпартыйныя, анты-ленінскія прамовы і артыкулы накшталт «Заметак эканамістага» і «Палітычнага паказу», захоўваюць сваю моц. Уся ідэёвая зброя, выкаваная правымі ўхілістымі для барацьбы супроць партыі, застаецца ў іх руках.

Сэнс гэтага тактычнага павароту правых зусім ясны і зразумелы. Ідэёвую разьбітую армію трэба, як мага хутчэй вывесьці з бою, прывесьці ў парадак, падрыхтаваць для новага наступленьня супроць партыі. Партыя мела ў справу з такім-жа манэўрам восьмага 1926 году з боку трацкістых, якія тады падалі заяву ад 16-га кастрычніка з прызнаньнем раду памылак, а мовы ад фракцыйнасьці і г. д. Трацкістыя, як гэта ўжо цяпер зусім відавочна, сваім тагачасным манэўрам хацелі ашукаць партыю і ўсыпіць пільнасьць. Цяпер правыя апартуністыя трапілі ў такое-ж становішча, у якім трацкістыя знаходзіліся восьцьмю 1926 г. Ім патрэбна перадышка да больш спрыяючага зьнепадку. Там убачым. Аводь напаткаюцца турднасьці. Таму правыя супакоіваюць партыю фальшывымі фразамі аб згодзе з генэральнай лініяй. Таму яны паблажліва прызнаюць нашы дасягненьні. Між іншым, з прызнаньня дасягненьняў робяцца часамі агаворкі (плян пашырэньня пасеўнай плошчы ня выкананы, жывёлагадоўля стаіць дрэнна і г. д.). Але сваіх асноўных ідэёвых пазыцый прагадары правых (такі самы, як і трацкісты ў 1926 годзе) яшчэ не здалі. Ці можа партыю ашукаць гэта наскрозь шыты белымі ніткамі маневр? Ці можа партыя пакінуць правай апазыцыі разьвязанымі рукамі для аднаўленьня барацьбы?

Зусім відавочна, што партыя не дазволіць сябе ашукаць і бязьлітасна вырве падвойную гульню правай апазыцыі. У напружанай клясавай барацьбе, якая адбываецца ў краі, поглядзі правай апазыцыі ня маюць нічога агульнага з бальшавізмам і ленінізмам. Яны несумяшчальны ні з генэральнай лініяй партыі, ні з яе праграмай. Партыя патрабуе ад правых ухілістых безадкладнага, самага рашучага і рэшуцыйнага адмаўленьня ад сваіх апартуністычных поглядаў, поўнага і безагаворачнага ідэёвага разбраеньня.

Пытаньне пастаўлена рубам. Альбо зарваўшыяся правадыры правай апазыцыі і іх прыхільнікі адмовяцца ад сваіх няленінскіх і непартыйных поглядаў, альбо **партыя** давядзе да канца барацьбу супроць правай апазыцыі, зрабіўшы патрэбныя вывады ня толькі палітычныя, але і арганізацыйныя.

(«ПРАВДА»)

Грамадзянская вайна ў Кітаі

КРЫВАВЫЯ БАІ Ў ХЭНАНЬСКАЙ ПРАВІНЦЫІ

ПАРАЖЭНЬНЕ ЧАН КАЙ-ШЫ

ПЭЙПІН, 12. Агенцтва «Рэйтэр» падае, што становішча нанкінскіх войск на Хэнанскім фронце крытычнае. Нанкінскі ўрад перакінуў усе ўзброеныя сілы, якія знаходзяцца ў яго распараджэньні, на Хэнанскі фронт, ня спыняючыся перад значным паслабленьнем абароны Ухана. Адначасова «Сін-Бун-Рэнго» паведамляе, што Чан Кай-шы абгаварвае са сваімі нямецкімі ваенымі экспэртамі пытаньне аб падрыхтоўцы усеагульнага наступленьня супроць Фынь Юй-сяна праз 2 тыдні.

Афіцыйна-ж крыніцы сьцьвярджаюць, што быццам пасьля ўпартых баёў нанкінскім вайскам удалося з вялікімі ахвярамі адбіць Мінсян і пачаць наступленьне на Танфын. Наколькі гэта праўдападобна, трудна судзіць, бо, на вестках амэрыканскай газэты «Івнінг Пост», вайскі Гаміньцзюна ня толькі не ачысьцілі Мінсян, але занялі з дапамогаю партызанцкіх атрадаў, якія дзейнічаюць на іх баку, Ючжоў. Ад Мінсяна вайскі Гоміньцзюня наступаюць, па вестках той-жа газэты, на ўсход і знаходзяцца, нібы-та, у 7 мілях ад Пэйпін-Ханькоўскай чыгункі.

Дапускаючы праўдападобнасьць нанкінскіх сцьвярджэньняў, агенцтва «Сін-Бун-Рэнго» адзначае, што адбіць Танфын нанкінцам будзе вельмі цяжка, бо Тан Юй-сян згуртаваў у гэтым раёне 100 тысяч войска і подступы да гораду даволі грунтоўна умацаваны. Па вестках «Рэйтэр», у нанкінскіх вайсках ня ўсё добра. Нанкінскія часьці на берагох ракі Хан і ў Сянані перайшлі на бок Фынь Юй-сяна. Сярод часьцей, якія прыбываюць у Ханькоў шмат ненадзейных. Чан Кай-шы вярнуўся з фронту ў Ханькоў. Гэта разглядаецца як адзнака цяжкага становішча і таму трымаецца ў сакрэце.

НАНКІНЦЫ Ў ХУБЭЙСКАЙ ПРАВІНЦЫІ АДСТУПАЮЦЬ БЯЗ БОЮ

ШАНХАЙ, 15. Пацьвярджаюцца факты заняцьця атрадамі Гаміньцзюна гораду Лао-хасо-хоў (Хубэйская правінцыя) без супраціўленьня з боку нанкінцаў. Адтуль войскі Гаміньцзюна наступаюць у напрамку да гораду Сянь-ян-фу (Хубэйская правінцыя), дзе нанкінцы ўмацоўваюць свае пазыцыі.

На фронце вакол гораду Тэн-фюня (Хэнань) адбываюцца крывавыя баі. колькасьць ахвяр такая вялікая, што кітайскі чырвоны крыж ня ў стане аказаць дапамогу раненым. Раненыя ва многіх раёнах кінуты на волю лёсу.

Нядаўна самалёты Гаміньцзюна бамбардавалі цягнікі Чан Кай-шы і Тан Шэн-чы. Паведамляюцца аб новым наўстанні нанкінскіх войск у заходній часьці Хубэйскай правінцыі.

Значныя посьпехі войск Чан Фа-Гуя

ШАНХАЙ, 12. Як падае «Рэйтэр», у Гонг-Конгу за апошнія дні значна скарацілася лічба гандлёвых дагавораў з кітайскімі купцамі, бо ходзяць упарыя чуткі, што Чан Фа-гуй у працягу 3-х бліжэйшых тыдняў зойме Кантон. Паміж авангардам Чан Фа-гуя і кантонскімі вайскамі, якія разьмешчаны на поўнач ад Пінло (на ўсходзе Гуансійскай правінцыі ў 120 кілёмэтрах ад Гуандунска-Гуансійскай граніцы), адбываецца перастрэлка. Паведамляюць, што гуансійскі генэрал Чэн Чы-мо здрадзіў нанкінскі ўрад і, перайшоўшы на бок Чан Фа-гуя, значна ўзмацніў шансы Чан Фа-гуя на перамогу.

***

ПЭЙПІН, 12. Сін Чэн-бао паведамляе з Шанхаю, што часьці войск Чан Фа-гуя ўдалося заняць горад Фучжоу (важны стратэгічны пункт у Гуансійскай правінцыі).

Вынайдзена новая каўчука-носная расьліна

САМАРКАНД, 13. У Самаркандзкай акрузе вынайдзена невядомая да гэтага часу каўчука-носная расьліна—кузінія. Кузінія мае каля 20 проц. каўчуку—у два разы больш, чым хандрыла. Кусты кузініі растуць у розных раёнах Узьбэкістану ў вельмі значнай колькасьці.

У розных францускіх гарнізонах адбываліся шматлікія салдацкія дэманстрацыі-пратэсты. Салдаты дэманстравалі з пяяньнем «Інтэрнацыяналу». (З газэт).

Да падрыхтоўкі чарговых перавыбараў саветаў

Згодна пастановы прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту ад 15-га студзеня па 1-га красавіка 1930 году, у БССР будзе праведзена справаздачна-перавыбарчая кампанія сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў, а таксама адбудуцца і раёныя зьезды саветаў.

Галоўнай адзнакай надыходзячай перавыбарчай кампаніі зьяўляецца тое, што яна будзе праводзіцца ва ўмовах нябывалага пасьпяховага наступленьня на капіталістычныя элэменты гораду і вёскі, што няўхільна вызывае шалёнае супраціўленьне ўсіх клясавых ворагаў дыктатуры пралетарыяту.

Адгэтуль перавыбары саветаў зьяўляюцца важнейшай і самай масавай з правадзімых партыяй і савецкай уладай кампаній, натуральна робяцца фокусам, у якім найбольш яскрава і шырока разгортваецца клясавая барацьба.

Перавыбары саветаў ёсьць фактар, які актывізуе і ўцягвае ў сацыялістычнае будаўніцтва, у актыўнае кіраўніцтва нашай краінай новыя пласты рабочых і актыву працоўнага сялянства.

Перавыбарчая кампанія мінулага году прайшла пры надзвычайна ўзросшай актыўнасьці ўсіх працоўных гораду і вёскі і асабліва пралетарскай іх часткі.

Нашай задачай у надыходзячым перавыбары зьяўляецца: ня спыняцца на посьпехех мінулай кампаніі, а паставіць ва ўсю шырыню пытаньне аб уцягненьні ў перавыбары саветаў поўнасьцю працоўных гораду і вёскі ўсіх нацыянальнасьцяй, бо ўсё-ж 41,3 проц. выбаршчыкаў на вёсцы, 36,5 проц.—у мястэчку і 28,9 проц. у горадзе ня прынялі ніякага ўдзелу ў мінулых перавыбарах. Працоўная сялянка, ня гледзячы на вялізарны рост актыўнасьці, на 57,6 проц. яшчэ засталася па-за ўдзелам у такой важнейшай палітычнай кампаніі жыцьця і будаўніцтва краіны, якой зьяўляюцца перавыбары саветаў.

У палітычных выніках апошняй перавыбарчай кампаніі мы мелі далейшае згуртаваньне рабочых і бяднацка-серадняцкіх мас вакол лініі партыі, далейшае ўзмацненьне саюзу рабочае клясы з асноўнай масай сялянства і поўны крах імкненьняў кулака і нэпмана шырока пашкодзіць справе перавыбараў саветаў. Усе гэтыя дасягненьні павінны знайсьці ня толькі замацаваньне, але і далейшае сваё разьвіцьцё і паглыбленьне ў надыходзячую перавыбарчую кампанію.

Выкрыўшы бязьлітаснай крытыкай і самакрытыкай на выбарчых сходах усе недахопы работы саветаў, перавыбары павінны зрабіцца магутным штуршком далейшага ажыўленьня і палепшаньня работы саветаў і іх камісій і гэтым самым павялічыць кіруючую ролю саветаў, ня толькі як адміністрацыйных органаў, але і як цэнтраў гаспадарча-культурных, як кіраўнікоў калектывізацыі.

Каб дамагчыся гэтых вынікаў, неабходна безадкладная дасканалая ўсебаковая падрыхтоўка перавыбарчай кампаніі ва ўсіх яе галінах па лініі ўсіх партыйных савецкіх і грамадзкіх арганізацый.

Неабходна зараз-жа падабраць клясава-вытрыманы і працаздольны склад выбіркомаў, наладзіць сыстэматычнае іх інструктаваньне і кіраўніцтва імі.

Важнейшай умовай пасьпяховага правядзеньня кампаніі зьяўляецца добрая пастаноўка арганізацыйнай падрыхтоўкі да кампаніі ўсяе грамадзкасьці, актывізацыя бяднаты, батрацтва і працоўных жанчын, моладзі, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў праз сыстэму адпаведных нарад, сходаў і канфэрэнцый, арганізацыя бяднацка-серадняцкага актыву, праверка выкананьня саветамі наказу мінулага году, пабудова канкрэтных яскравых справаздач, прапрацоўка новых наказаў, усебакова-ўважлівая падрыхтоўка кандыдатур у склад новых саветаў. Ва ўсёй рабоце надыходзячых перавыбараў ні ў якім разе нельга дапускаць памылак мінулагодняй перавыбарчай кампаніі, калі мелі месца: выпадкі ўпчымленьня інтарэсаў і ролі серадняка ў выглядзе недапушчэньня яго на сходы беднаты, недастатковага ўцягненьня серадняка ў склад саветаў, выпадкі грубых памылак у справе пазбаўленьня і аднаўленьня ў выбарчых правох.

Складаньне сьпісаў выбаршчыкаў і асоб пазбаўленых выбарчага права павінна праводзіцца на падставе строгага кіраўніцтва інструкцыяй па перавыбарах саветаў, без усякіх прапускаў асоб, падлягаючых пазбаўленьню выбарчага права.

Неабходна дабіцца таго, каб у гэтую справаздачна-перавыбарчую кампанію ня было ніводнае савецкае ўстановы, ніводнай прафэсыянальнай, каапэрацыйнай і грамадзкай арганізацыі наогул, якая-б засталася ў баку ад падрыхтоўкі і правядзеньня справаздачнасьці і перавыбараў. Трэба канчаткова зьнішчыць часткай захаваны памылковы, палітычна шкодны погляд нібы-та перавыбары саветаў зьяўляюцца справай толькі саміх саветаў і выканкомаў.

Напрыклад, Наркамасьветы праз адпаведную арганізацыю сваіх кадраў, праз сетку ўстаноў палітасьветы, мае магчымасьць аказаць істотную дапамогу ў правядзеньні перавыбараў як па частцы агітац

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ПРАВЕРКА ПАРТЫІ

Узьнімем чыстку партыі на яшчэ большую палітычную вышыню

Выкрывайце тых, хто імкнецца прынізіць значэньне чысткі, хто прабуе скарыстаць чыстку ў сваіх асабістых інтарэсах Партарганізацыі, ачышчаючы свае рады ад ідэёва і клясава чужых элемэнтаў, павінны максымальна разгарнуць вярбоўку ў рады партыі новых кадраў перадавых рабочых, батракоў і с.-г. рабочых

УДАРЫЦЬ ПА ТЫХ, ХТО ІМКНЕЦЦА САРВАЦЬ ЧЫСТКУ ПАРТЫІ

Паклёпніцкая вылазка супроць праверкому на чыстцы ячэйкі Белжылсаюзу

Праверка і чыстка савецкіх ячэек КП(б)Б праходзіць пад знакам шырокай самакрытыкі. Праверка ачышчае савецкія ячэйкі ад камуністых, якія абюракраціліся і разлажыліся, ад тых, хто ў сваёй практычнай рабоце скажае клясавую лінію, ігнаруе партдырэктывы, змыкаецца з калацка-нэпманскімі элемэнтамі.

У гэтай важнай рабоце партыя ўскладае вялікія і адказныя задачы на праверачныя камісіі. Ад правільнай работы праверкомаў, ад чуласьці падыходу пры праверцы кожнай ячэйкі, кожнага члена партыі залежыць посьпех праведзімай чысткі. Масы партыйцаў і беспартыйных шчыра дапамагаюць праверкомам у выкананьні ўскладзеных на іх палітычных задач.

Аднак, у практыцы чысткі наглядаюцца выпадкі актыўнага і пасыўнага супраціўленьня чысткі партыі і рабоце праверкомаў з боку тых, каму чыстка пагражае пэўнымі арганізацыйнымі мерамі. Гэтыя элемэнты прабуюць сарваць чыстку партыі, рознымі спосабамі імкнучыся перашкодзіць нармальнаму ходу праверкі.

Для таго, каб сарваць чыстку, гэтыя элемэнты скарыстоўваюць усе сродкі і магчымасьці, ідучы на розныя манэўры. Адным з такіх манэўраў зьяўляецца зусім беспадстаўнае дыскрэдытаваньне праверкомаў. Такога роду вылазка супроць праверачнай камісіі мела месца гэтымі днямі ў ячэйцы КП(б)Б Белжылсаюзу.

Ужо з самага пачатку чысткі два члены ячэйкі **Ганцэвіч** і **Давыдаў** імкнуліся зганьбіць праверку ячэйкі. Яны на праверачных сходах у сваіх выступленьнях прабавалі дыскрэдытаваць асобных членаў партыі, зьвесьці асабістыя разрахункі, скарыстаць чыстку партыі ў сваіх асабістых інтарэсах. Сход ячэйкі аднадушна асудзіў гэтыя антыпартыйныя паводзіны Ганцэвіча і Давыдава. Спробы гэтых партыйцаў сарваць чыстку ня прынесьлі ніякіх вынікаў. Тады Ганцэвіч і Давыдаў выбіраюць другі шлях для зрыву чысткі ячэйкі. Яны прабуюць дыскрэдытаваць праверачную камісію. Ганцэвіч і Давыдаў падалі заяву ў прэзыдыум МенАКК аб тым, нібы старшыня праверкому **Юдэльсон** і член камісіі тав. **Захарава** няправільна праводзяць праверку, аднабакова і тэндэнцыйна падыходзяць да чысткі асобных камуністых, а таму «праверком трэба адклікаць».

Зразумела, што і на гэты раз спроба Ганцэвіча і Давыдава сарваць чыстку ячэйкі не ўдалося. Скліканы нечарговы сход парт'ячэйкі выкрыў усе махінацыі Давыдава і Ганцэвіча. Дасканалая праверка фактаў, якія паданы ў заяве, паказала ўсю іх беспадстаўнасьць і ілжывасьць. Сход ячэйкі канстатаваў, што заява Ганцэвіча і Давыдава зьяўляецца натлым паклёпам на праверачную камісію, і што **праверком праводзіць правільную палітычную лінію пры** чыстцы ячэйкі, жорстка рэагуючы на ўсялякія спробы асобных партыйцаў скарыстаць чыстку партыі ў асабістых інтарэсах. Паклёпніцкая вылазка Ганцэвіча і Давыдава атрымала жорсткі і рашучы адпор з боку парт'ячэйкі.

Трэба адзначыць, што такія факты не зьяўляюцца паасобнымі выпадкамі ў практыцы чысткі савецкіх ячэек КП(б)Б. Такія выпады (адзінковыя) супроць чысткі мелі месца і ў іншых ячэйках. Так, напрыклад, пры чыстцы ячэйкі Наркамзему член партыі **Лагучык** імкнуўся дыскрэдытаваць і зганьбіць старшыню праверачнай камісіі тав. **Бягуна.** Лагучык абвінавачыў т. Бягуна ў розных антыпартыйных учынках аж да крымінальных злачынстваў. Ячэйка выкрыла гэты абураючы агідны паклёп. Расьсьледваньне гэтага выступленьня паказала, што Лагучык выступіў з ілжывымі паклёпніцкімі беспадстаўнымі абвінавачаньнямі.

На гэтых фактах трэба завастрыць увагу партыйных арганізацый. Трэба яшчэ з большай энэргіяй, яшчэ з большай рашучасьцю змагацца са спробамі дыскрэдытаваць ідэю чысткі і беспадстаўна зганьбіць склад данага праверкому.

Мы павінны з ўсёй жорсткасьцю ўдарыць па тых «камуністых», якія імкнуцца сарваць чыстку партыі і беспадстаўна дыскрэдытуюць нашых лепшых таварышоў з праверкомаў.

С.

На праверачным сходзе

Чыстка калектыву Белдзяржбуду

Пачалася праверка і чыстка партка-лектыву **Белдзяржбуду.** Калектыў аб'яднае ўсе пабудовы Белдзяржбуду і тры цагельні Белстрамтрэсту. На гэтых пабудовах і прадпрыемствах працуе вялікая колькасьць сэзоньнікаў. Сярод сэзонных рабочых ёсьць шмат такіх, якія зьвязаны з сельскай гаспадаркай. Большасьць сэзонных рабочых мае серадняцкія гаспадаркі. Прыходзячы на пабудову, гэтыя рабочыя прыносілі з сабой сялянскія настроі, уласьніцкую ідэалёгію і г. д. Таму перад партыйным калектывам стаяла адказная задача па перавыхаваньні новых кадраў рабочых, па ўкараненьні ў масы сэзоньнікаў пралетарскай ідэалёгіі.

Трэба адзначыць, што ў асноўным парткалектыў гэту задачу выканаў. Будаўнікі бяруць актыўны ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве. Добра праведзены дзень індустрыялізацыі. Наогул асноўная маса рабочых горача адгукнулася на правядзеньне важнейшых кампаній.

Але побач з гэтым у радзе выпадкаў некаторыя рабочыя праяўляюць шкодныя антыпралетарскія настроі (рвацтва і выступленьні супроць сацыялістычнага спаборніцтва). Калектыў рэагаваў на гэта, праводзячы шырокую агітацыйна-растлумачальную работу.

Гэта сьведчыць аб тым, што ў асноўным калектыў зьяўляецца здаровым, ідэалёгічна вытрыманым і здольным праводзіць лінію партыі. Праўда, у практыцы калектыву яшчэ ёсьць рад недахватаў. Так, напрыклад, асобныя партыйцы нядбайна адносяцца да выкананьня партыйнай нагрузкі, яшчэ ня зьнішчаны выпадкі п'янства і парушэньня партыйнай дысцыпліны. Многія таварышы палітычна малапісьменныя. Калектыў павінен ужыць усе захады да зьнішчэньня гэтых недахватаў.

На праверачных сходах разгарнулася шырокая самакрытыка і крытыка работы бюро і парткалектыву. Бюро слаба рэагавала на невыкананьне гаспадарнікамі прапаноў вытворчых камісій. Бюро невыстарчальна кіравала калектывам ЛКСМБ і не зварачала ўвагі на работу сярод спэцыялістых. Партыйны калектыў павінен ужыць усе захады да зьнішчэньня гэтых недахватаў.

На праверачных сходах разгарнулася шырокая самакрытыка і крытыка работы бюро і парткалектыву. Бюро слаба рэагавала на невыкананьне гаспадарнікамі прапаноў вытворчых камісій. Бюро невыстарчальна кіравала калектывам ЛКСМБ і не зварачала ўвагі на работу сярод спэцыялістых. Партыйны калектыў павінен ужыць усе захады да зьнішчэньня гэтых недахватаў.

Ізалявaліся ад мас

(АД НАШАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Паўторная чыстка **Коханаўскай** парт-арганізацыі **(Аршаншчына)** выяўляе сапраўднае становішча партыйна - палітычнай работы ў раёне, якога ня здолела высьветліць праверачная камісія. Праверком дапусьціў у сваёй рабоце грубыя палітычныя памылкі, якія прымусілі АКК вызначыць паўторную чыстку раённай арганізацыі. Адным з вялізных і асноўных недахопаў арганізацыі зьяўляецца поўная адсутнасьць вярбоўкі с.-г. рабочых і батракоў у рады партыі. За час першай чысткі і па сёнешні дзень у арганізацыю паданы ўсяго тры заявы аб прыняцьці ў партыю. Гэты факт сьведчыць аб тым, наколькі праверачная камісія і ўся парт-арганізацыя не завастрылі ўвагі на пытаньнях вярбоўкі новых кадраў.

Батрацтва зусім на прысутнічала і ня прымала ўдзелу ў першай чыстцы партыйных ячэек. Ячэйкі не правялі літаральна ніякай работы сярод беднаты і батрацтва па растлумачэньні асноўных задач чысткі партыі і вярбоўкі. Ня дзіва, што арганізацыя зусім не расьце. І гэта ў той час, калі ў раёне ёсьць вялікія кадры для росту. Напрыклад, адных толькі батракоў і батрачак у Коханаўскім раёне налічваецца звыш тысячы. Адтолькі... двох батракоў. У арганізацыі ёсьць усяго 14 с.-г. рабочых, ня гледзячы на тое, што ў раёне працуе звыш 100 сталых с.-г. рабочых і работніц. Вінавата ў гэтым

М. М. Галадзед

Міжнароднае і ўнутранае становішча СССР

Даклад на ўрачыстым пасяджэньні Менскага гарсавету разам з партыйнымі, прафэсыйнымі, камсамольскімі арганізацыямі і прадстаўнікамі чырвонаармейскіх частак, ПРЫСЬВЕЧАНЫМ XII ГАДАВІНЕ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

Таварышы, наперакор капіталістычнаму сьвету і ўсім прарокам з белагвардзейскага лягеру, пралетарыят Савецкага Саюзу сьвяткуе ўжо XII-ю гадавіну сваіх перамог у барацьбе за пралетарскую рэвалюцыю. Усе мы памятаем тыя дні, калі рабочая кляса пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі бальшавікоў вышвырнула магутным ударам рэвалюцыйных мас за межы пралетарскае дзяржавы ўсе падонкі былога капіталістычнага грамадзтва. І вось, тэрміны рэшткі былых людзей, рэшткі белагвардзейшчыны прарочылі рабочым і сялянам Савецкага Саюзу, што савецкая ўлада будзе жыць ня больш, як 10 дзён. Пасьля яны прарочылі жыць нам 10 тыдняў, а потым 10 месяцаў. А мы, наперакор ім, пражылі 12 год і прарочэньні белагвардзейскіх адкідаў ня спраўдзіліся.

29-га верасьня 1929 г. белагвардзейская газэта, якая выдаецца ў Рызе пад назвай «Сегодня», сьвяткавала сваю 10-ю гадавіну. Газэта зьвярнулася ў гэтым нумары з анкетай да белагвардзейскіх дзеячоў пад такім загалоўкам: «Што будзе праз 10 год з Расіяй»? У адказ на такое запытаньне белагвардзейскія ідэолёгі парознаму пішуць. Але тут характэрна ня так тое, што яны пішуць, як само пытаньне: калі ў першыя дні заваяваньня ўлады пралетарыятам нашы клясавыя ворагі прарочылі нам жыць 10 дзён, дык цяпер і белагвардзейская газэта ставіць пытаньне — «што будзе **праз 10 год»**. Такім чынам на 10 тыдняў, на 10 месяцаў і яны ўжо не разьлічваюць. Гістарычны ход пралетарскай рэвалюцыі, гістарычны ход будаўніцтва сацыялізму ўжо і нашы клясавыя ворагі пачынаюць вымяраць дзесяткамі гадоў.

Таварышы, XII-ты год пралетарскай рэвалюцыі адзначаецца бурным і магутным ростам пазыцый сацыялізму, ён адзначаецца глыбокім і магутным пераломам на ўсіх франтох нашага будаўніцтва. XII год Кастрычніцкай рэвалюцыі зьяўляецца годам вялікага пад'ёму, нячуванага дагэтуль вытворчага энтузіязму шырокіх рабочых мас. Гэта і ёсьць тое новае, тое адзначнае, чаго мы не маглі бачыць у першыя гады. Гэты карэнны пералом у нашым росьце праводзіўся на працягу апошніх гадоў пад знакам рашучага і ўзмоцненага наступленьня сацыялізму на капіталізм, наступленьня пралетарскіх пазыцый на кулацка-нэпманскія элемэнты. Гэты год праходзіў ва ўмовах завостранай клясавай барацьбы, у якой пралетарыят усё больш і больш замацоўвае свае пазыцыі.

У мінулыя гады, калі мы падводзілі вынікі нашых дасягненьняў, мы рабілі параўнаньні ў нашых дасягненьнях на гаспадарчым фронце з даваенным часам. Даваенны ўзровень гаспадаркі былой царскай Расіі ў папярэднія гады вымернікам нашага паступовага ходу ўперад ад тэй разрухі, якую нам пакінула імпэрыялістычная вайна 1914—18 г. г. Але сёньня гэтае параўнаньне з даваенным пэрыядам мы пакінулі ўжо даўно і далёка ззаду. Сёньня мы праводзім параўнаньне з тым, як мы выконваем лёзунг вялікага настаўніка і правадыра пралетарыяту Леніна, лёзунг нашай партыі ад тым, каб «дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя дзяржавы ў тэхнічна-эканамічных адносінах». Гэта зараз ужо для нас павінна быць асноўным вымернікам нашых дасягненьняў.

Ці можам мы сёньня пахваліцца ў гэтым напрамку нашымі дасягненьнямі? Так, можам. **Мы ўжо стаім абедзьвюма нагамі на шляху тэхнічнай рэвалюцыі ў нашай народнай гаспадарцы, ва ўсёй краіне саветаў; мы ўжо стаім абедзьвюма нагамі на рэйках выпярэджаньня капіталістычнай тэхнікі.**

Досыць спаслацца на рад карэспандэнцый, якія друкуюцца ў буржуазных і капіталістычных газэтах у Эўропе і Амэрыцы, каб паказаць, як нават і прадстаўнікі капіталізму, якіх ні ў якім разе ня можна западозрыць у сымпатызаваньні савецкай уладзе, як усё-ж такі і яны гавораць, што таму, што робіцца ў Савецкім Саюзе як у галіне індустрыі, так і ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, што гэтаму можа пазайздросьціць любая капіталістычная дзяржава, у тым ліку і капіталістычна-фэрмэрская сельская гаспадарка Амэрыкі.

Адзін з карэспандэнтаў буржуазнай газэты піша з Масквы, што тая барацьба ў вёсцы, якая зараз адбываецца ў Савецкім Саюзе, ня ёсьць барацьба сялянства са сваёю ўладаю, а ёсьць барацьба дзьвёх кляс: клясы, якая падтрымліваецца савецкаю ўладаю і камуністычнай партыяй, (чытай беднаты і серадняка) і клясы буйных кулакоў. Гэткая ацэнка прадстаўніка капіталістычнага друку і, памойму, зусім правільная. Супроць такой ацэнкі мы можам і не супярэчыць, хоць яна і даецца прадстаўнікамі капіталізму. Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што калі любы прадстаўнік буржуазных колаў зазірне ў рэальнасьць нашай эканомікі і палітычна - грамадзкіх адносін, дык і ён можа, хоча ён гэтага ці не, убачыць сапраўдны паступовы працэс на фронце заваяваньняў пазыцый сацыялізму.

I. Асноўныя моманты міжнароднага становішча

Таварышы! Тое, што мы робім і што мы маем у якасьці дасягненьняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, усё гэта праводзіцца намі ў вельмі цяжкіх умовах жорсткай барацьбы міжнароднага капіталу супроць Савецкага Саюзу. Пытаньні міжнародных узаемаадносін Савецкага Саюзу былі, ёсьць і будуць заставацца аднэй з тых прычын, якія ў некаторай ступені вызначаюць умовы нашага паступовага ходу наперад да сацыялізму. Бо вы ведаеце, што эканамічная блёкада ў пэрыяд мірнага сацыялістычнага будаўніцтва ня скончана, як адкрытая, так і скрытая. Эканамічны паціск капіталістых на Савецкі Саюз адбываецца бесьперапынна, і мы прымушаны вытрымліваць гэты вялікі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва і росту на ўласныя сродкі.

Няма чаго і думаць аб тым, каб мы разьлічалі і ў далейшым на шырокія кредыты для мэт нашай індустрыі. Праўда, пашы ўзаемаадносіны ў галіне эканомікі з кожным годам пашыраюцца з рознымі капіталістычнымі дзяржавамі, бо і паасобным капіталістычным дзяржавам і паасобным капіталістым карысна мець эканамічныя ўзаемаадносіны з краінаю, якая індустрыялізуецца, якая непамерна хутка расьце, якая можа спажываць і ўжо спажывае на сотні мільёнаў рублёў прамысловай прадукцыі, якая ўжывае для свайго сацыялістычнага будаўніцтва на мільярды рублёў розных прылад. Але тут у капіталістых эмагаюцца два пачаткі: адзін пачатак — імкненьне зарабіць ад Савецкага Саюзу, другі пачатак — клясавае варожасьць да тых асноўных прынцыпаў, якія заложаны ў сыстэме савецкай дзяржавы. Ня гледзячы на гэта, мы ўсё-ж такі пашыраем нашы эканамічныя ўзаемаадносіны з цэлым радам капіталістычных краін.

Калі-ж коратка спыніцца на пытаньнях міжнароднай палітыкі, дык іх можна было-б у кароткіх рысах фармуляваць наступным чынам. Вузлавымі пунктамі міжнароднай палітыкі і дагэтуль, як і раней, зьяўляюцца наступныя пытаньні: напершае, узаемаадносіны Савецкага Саюзу, з аднаго боку, і капіталістычных дзяржаў, з другога, падругое, барацьба паміж Амэрыкаю і заходня-эўрапэйскім кантынэнтам за гегемонію на сусьветным рынку; патрэцце, кітайскі вузел і, пачацьвертае, рост супярэчнасьцяй паміж капіталістычнымі дзяржавамі Заходняй Эўропы за гегемонію на эўрапэйскім кантынэнце.

Я не гавару ужо ад тых клясавых супярэчнасьцях, якія растуць унутры капіталістычных дзяржаў, бо ў гэтых адносінах рэвалюцыйны рух рабочае клясы ва ўсім сьвеце ідзе настолькі шпаркім тэмпам наперад, што мы ўпэўнены ў тым, што пралетарская рэвалюцыя ў радзе капіталістычных дзяржаў Эўропы ўжо стаіць на парадку дня.

Як абстаіць справа з палітыкаю Савецкага Саюзу ў адносінах да капіталістычных дзяржаў, а таксама і капіталістычных дзяржаў у адносінах да Савецкага Саюзу? Трэба сказаць, што за апошні год на Захадзе ў нас асаблівых перамен ня здарылася ў міжнароднай палітыцы Савецкага Саюзу. Наша асноўная ўстаноўка на мір, на ўстанаўленьне міру застаецца генэральнаю ўстаноўкаю на працягу ўсяго часу ў адносінах да ўсіх капіталістычных дзяржаў.

Вы ведаеце з друку аб аднаўленьні дыпляматычных адносін з Англіяй. Калі гэта справа ішла і ідзе наперад ціхімі крокамі, то не па нашай віне, а па віне ангельскага «рабочага» ўраду.

Найбольш істотным фактам нашай міжнароднай палітыкі зьяўляецца такое пытаньне, як канфлікт на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы. За спіной Чан Кайшы стаіць амэрыканскі і ангельскі капітал, і, толькі дзякуючы гэтаму, канфлікт на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы для нас мае сусьветнае значэньне. Урад Савецкага Саюзу рабіў усё для таго, каб уладзіць узаемаадносіны з Кітаем, для якога Савецкая ўлада адмовілася ад усіх былых прывілей царскай Расіі, якімі яна карысталася на тэрыторыі Кітаю. Савецкі Саюз — адзіная дзяржава, якая па ўласнай ініцыятыве пайшла на ўстанаўленьне роўнапраўных дагавораў паміж дзьвюма дзяржавамі — СССР і Кітаем. Ня гледзячы на гэта, пры нацкоўваньні сусьветнага імпэрыялізму, гэты дагавор кітайскімі Чан Кай-шы парушаны. Мы і цяпер робім і рабілі ўсё для таго, каб устанавіць нармальныя ўзаемаадносіны, каб ліквідаваць створаны канфлікт. Аднак, нашы інтарэсы, інтарэсы Савецкага Саюзу і інтарэсы савецкай мяжы мы будзем абараняць усёй сілай пралетарскай дзяржавы. Мы будзем да канца цьвёрдымі, ніякіх уступак рабіць ня будзем. Дзякуючы такому палітычнаму становішчу ў адносінах да Кітаю, нам прышлося ўзмацніць нашу Чырвоную армію на ўсходняй мяжы, і ўсе чырвонаармейскія часьці, якія там былі ў нас на ўсходзе, аб'яднаць у адну Далёка - Ўсходнюю армію. Мы цяпер бачым, што гэты браніваны кулак пралетарскай дзяржавы дае нам магчымасьць весьці і далей пасьлядоўна да канца цьвёрдую палітыку на Далёкім Усходзе.

Трэба спыніцца на нашых узаемаадносінах з Польшчай, з нашай бліжэйшай суседкай. Я павінен адзначыць, што ва ўзаемаадносінах Польшчы з намі на працягу ўсяго часу існаваньня было больш цёмных плям, чым добрасуседзкіх узаемаадносін. Зацямненьне на краявідзе зьяўляецца вельмі часта, і вось у цяперашні пэрыяд на краявідзе паказваюцца хмары. Па якіх прычынах нашы ўзаемаадносіны ня ідуць на лад з Польшчай? Трэба адзначыць, што ў цяперашні пэрыяд унутраное становішча Польшчы такое, што яна ідзе простымі крокамі да вернага эканамічнага краху.

Толькі паўгода таму назад мне прышлося на зьезьдзе саветаў БССР падаць некаторыя факты аб яўным эканамічным крызісе ў Польшчы, у які яна ўвайшла ў 1928-29 г. Прайшло паўгода, становішча ніяк не зьмянілася. Пытаньне эканамічнага крызісу ў Польшчы ня сходзіць з парадку дня, і шчырыя ці праўдзівей хоць крыху аб'ектыўныя эканамістыя Польшчы адкрыта заяўляюць, што пытаньне дэпрэсіі, пытаньне расхістваньня кан'юнктуры зьяўляецца рэальнасьцю для гаспадаркі Польшчы. Аб гэтым піша вядомы эканамісты Польшчы Кжыжаноўскі, які карыстаецца ў іх не малой пашанай ва ўрадзе Пілсудзкага, як выдатны эканамісты.

Польскія генэралы будуюць ваенныя пляны супроць Савецкага Саюзу. У цяперашні пэрыяд, з прычыны цяжкасьці эканамічнага становішча ў Польшчы, хваля шалёнага цкаваньня Савецкага Саюзу разгарнулася даволі шырока. Хваля варожасьці да СССР, нацыянальнай варожасьці — гэта хваля шырока раскацілася па ўсёй буржуазнай фашыстоўскай Польшчы і ў апошні час, па прыкладзе 1927 г., мы маем шалёнае цкаваньне польскай фашыстоўскай урадовай прэсай нашага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве, як усяго прадстаўніцтва, так і асобных яго дзеячоў. Гэта зьяўляецца асноўнай тэмай усёй польскай прэсы. Адпаведная падрыхтоўка вядзецца фашыстоўскім друкам і па іншых галінах. Палітыка польскага ўраду да меншасьцяй Польшчы таксама зьмянілася. Напрыклад, у адносінах да левага радыкальнага кірунку нацыянальнага руху польскі ўрад вядзе ўзмоцненую барацьбу, а больш здрадніцкую верхавіну з меншасьцяй пачынае купляць за паасобныя падачкі для таго, каб праз іх, як, напрыклад, праз беларускіх Луцкевічаў, Станкевічаў, Астроўскіх і Ярэмічаў усё больш і больш настройваць масы супроць Саюзу ССР і супроць СССР.

Такім чынам, вострасьць пытаньня сёньня ва ўзаемаадносінах польскага ўраду з намі застаецца, аб чым рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі павінны ведаць.

II. Паказчыкі росту сацыялістычнай гаспадаркі СССР

Вось, таварышы, ня гледзячы на тое, што нам усё-ж такі перашкаджаюць мірна будаваць, што нас эканамічна блёкуюць, што многія хочуць на абвастрэньні ўзаемаадносін з намі адтаваць сябе ад пагібелі і выслужыцца перад імпэрыялістычнымі дзядулямі, мы ўсё-ж такі, ня гледзячы на такія складаныя міжнародныя абставіны, маем значныя дасягненьні ў заваяваньні сацыялістычных пазыцый у нашым Савецкім Саюзе.

Калі мы возьмем такое пытаньне, як рост асноўных фондаў народнай гаспадаркі ва ўсім Саюзе ССР, дык можам убачыць наступны малюнак: асноўныя фонды ў 1925 годзе па дзяржаўным сэктары ва ўсёй народнай гаспадарцы вымяраліся ў 59,9 мільярдаў рублёў, а ў 1929 г. кошт фонду ўсёй народнай гаспадаркі вырас да 74,6 мільярдаў руб., а на 1929-30 г. рост вызначаны да 85,9 мільярдаў рублёў. Я бяру акругленыя лічбы. Гэтыя лічбы гавораць аб вялізарнейшым тэмпе росту асноўных фондаў нашай народнай гаспадаркі па дзяржаўным сэктары.

Цяпер возьмем капітальныя фонды ў нашай прамысловасьці, г. зн. індустрыяльныя фонды. Яны вымяраюцца наступнымі лічбамі: у 1925 г. фонд прамысловасьці па дзяржаўным сэктары складаў 5,9 мільярдаў рублёў, у 1928 годзе — 10,4 мільярдаў руб., а ў 1929-30 годзе будзе складаць 14 мільярдаў рублёў.

Па электрыфікацыі — асноўным мерапрыемстве — павышэньні тэхнічнага энэргетычнага ўзроўню, як асноўнага мерапрыемства па выкананьні лёзунгу «дагнаць і перагнаць капіталістычныя дзяржавы ў тэхнічна - эканамічных адносінах», па гэтай важнейшай галіне індустрыялізацыі краіны, па электрыфікацыі, мы маем таксама вялікі рост асноўных фондаў. Напрыклад, у 1925 годзе ён складаў 356 мільёнаў рублёў, у 1929 г., г. зн. у мінулым гаспадарчым годзе, гэты фонд электрыфікацыі раўняўся 1.300 мільёнаў рублёў, а ў 1930 г. ён у круглых лічбах будзе раўняцца 2 мільярдам рублёў.

Калі мы возьмем рост валавой прадукцыі прамысловасьці па Савецкім Саюзе, дык гэта выглядзіць наступным чынам: валавая прадукцыя прамысловасьці вырасла ў 1928-29 г. на 23,7 процантаў, на наступны — 1929-30 г. — запраектаваны рост на 32 проц. з ростам валавой прадукцыі па цяжкой індустрыі на 46 проц.

Капітальныя ўкладаньні ў нашу прамысловасьць ва ўсім Савецкім Саюзе ў 1929-30 годзе будуць раўняцца, прыкладна, 3.400 млн. руб. замест 1 мільярда 600 з лішкам млн. у мінулым годзе, прычым больш двух з паловаю мільярдаў капітальных укладаньняў падае на цяжкую індустрыю.

Возьмем сельскую гаспадарку. Па сельскай гаспадарцы ва ўсім Савецкім Саюзе яе асноўныя фонды расьлі наступным чынам: у 1925 г. гэты фонд раўняўся 25 мільярдам рублёў, 1929 г. — 29,9 мільярд. руб. і ў 1930 г. фонд сельскай гаспадаркі ўзрастае да 32 мільярдаў рублёў. Як бачыце, асноўнае накапленьне ў сельскай гаспадарцы па ўсіх галінах яе вытворчасьці, у тым ліку і на яе мэханізацыі, расьце даволі шпаркім тэмпам. Калі вы возьмеце капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку, дык яны вымяраюцца наступным чынам: у 1929 г. усе нашы мерапрыемствы, у тым ліку і індустрыяльныя мерапрыемствы ў самой сельскай гаспадарцы, раўняліся 2 мільярдам 900 млн. руб. (укладаньні з боку дзяржавы), а ў 1930 г. у сельскую гаспадарку ўкладаецца 4 мільярды руб., сюды ўваходзіць, як ужо я паказаў, ня толькі ўлажэньне ў паляводзтва, але і пытаньне забесьпячэньня машынамі, інвэнтаром, утнаеньнямі і інш. і пытаньне індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі.

Вось, таварышы, асноўныя паказальнікі, якія характарызуюць тыя працэсы ў разьвіцьці і індустрыялізацыі народнай гаспадаркі, што адбыліся ў нас на 12-м годзе Кастрычніка. Найбольш характэрным і найбольш важным у разьвіцьці сельскай гаспадаркі зьяўляецца той вялічэзны калгасны рух, які мы мелі на працягу апошняга году, акрамя таго і тыя пэрспэктывы, якія вызначаюцца ўжо зараз гэтым калгасным рухам.

Найбольш характэрным і рашучым фактарам, які прадрашае пасьпяховы лёс сацыялістычнай перабудовы нашай сельскай гаспадаркі, гэта фактар той, што ў наступным годзе мы будзем мець ад саўгасаў і калгасаў 50 проц. таварнага збожжа, г. зн. больш 400 мільёнаў пудоў.

Таварышы, гэты фактар арганізацыі сацыялістычнага зямляробства зьяўляецца рашаючым у разьвіцьці народнай гаспадаркі, зьяўляецца рашаючым у забесьпячэньні высокіх тэмпаў народнагаспадарчага разьвіцьця, высокіх тэмпаў індустрыялізацыі таму, што мы будзем мець збожжа з аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, а вы ведаеце, што нельга ажыцьцяўляць плянаў індустрыялізацыі, нельга вытрымліваць высокіх напружаных тэмпаў нашага будаўніцтва не забясьпечыўшы выкананьне гэтых плянаў адпаведнай колькасьцю збожжа. Гэта для ўсіх зьяўляецца бясспрэчным. Генэральная лінія нашай партыі заключалася ў тым, што мы павінны арганізоўваць буйныя сацыялістычныя фабрыкі збожжа (саўгасы і аб'яднаньне дробных сялянскіх гаспадарак у буйныя калгасы), а правааапартыністычная бухарынская апазыцыя раіла партыі арыентавацца на кулацкі хлеб, робячы кулаку ўступкі.

Пытаньне хлебазагатовак заўсёды складала асноўную частку нашае палітыкі і гаспадарчага пляну. На пытаньнях хлебазагатовак на гэтай кампаніі вымяралася і выразнасьць правадзімай намі клясавай лініі ў вёсцы, вымяралася і палітычная ўстойлівасьць рабочых мас і асноўнай масы бядняцка-серадняцкага сялянства. І вось тое, што наш аграмаджаны сэктар у наступным годзе дасьць 50 проц. таварнага збожжа, гэта магутны фактар, які цалкам, папершае, падмацоўвае правільнасьць генэральнай лініі нашай партыі, лініі на сацыялістычную перабудову вёскі на базе калектывізацыі. падругое, цалкам перакульвае ўсякія панінёрскія сьцьверджаньні правай бухарынскай апазыцыі, што мы нібы-та ня можам, як казала правая апазыцыя ў мінулым годзе, разьлічваць на атрыманьне хлеба з саўгасаў і калгасаў, мы павінны браць у кулака. «Нам усё роўна чый хлеб, толькі-б ён быў»—так яны казалі. Партыя тады казала: «калі вам усё роўна, дык партыі ня ўсё роўна». Усё роўна можа быць таму, хто можа браць збожжа шляхам уступак кулаку. А партыя ніколі ня думала і ня будзе думаць заагатаўляць хлеб у кулака шляхам уступак.

III. БССР ідзе шпаркім тэмпам наперад па шляху сацыялістычнага разьвіцьця

Некалькі заўваг, якія характарызуюць вынікі гаспадарчага будаўніцтва БССР. Па Беларусі мы маем такое становішча: рост валавой прадукцыі па цэнзавай прамысловасьці за мінулы год мы маем на 50,5 проц., а па прамысловасьці ВСНГ — на 45 проц., гэта азначае, што асноўная валавая прадукцыя на прамысловасьці ВСНГ вырасла з 119 млн. да 175 млн. руб. На наступны год мы вызначаем рост валавой прадукцыі па цэнзавай на 60 проц., а па прамысловасьці ВСНГ — на 65 проц. Праграму капітальных работ у Беларусі мы на 1929-30 г. вызначылі ў 52 млн. руб. Я павінен зазначыць, што гэта яшчэ не канчатковая праграма, яна яшчэ будзе мець рад карэктыў у сувязі з увязкай пляну капітальнага будаўніцтва ўсяго Савецкага Саюзу. Але гэтае адхіленьне будзе невялікае. Аб'ём гэтай праграмы капітальных работ у 52 млн. руб., гэта вызначана супроць праграмы мінулага году ў 28-30 млн. руб. Як бачыце, які гіганцкі рост намячаецца ў нас на прамысловым будаўніцтве на наступны год.

Па сельскай гаспадарцы асноўнае нашае дасягненьне ў БССР, як і ва ўсім Саюзе, гэта было тое, што мы за мінулы год здолелі значна разгарнуць забесьпячэньне сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці. Пытаньне мінэральнага ўгнаеньня, забесьпячэньня машынамі, чыстагатунковым насеньнем і г. д. —усё гэта было разгорнута шырокім фронтам і, дзякуючы гэтаму, мы маем значнае павялічэньне валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі БССР.

Ўраджай у 1929 г. мы характарызуем павялічэньнем больш, чым на 20 проц. Для Савецкай Беларусі асабліва магутным дасягненьнем зьяўляецца пытаньне калектывізацыі. Вось тыя лічбы, якія я вам падам, пакажуць, якім тэмпам у 1929 г. разгарнулася сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі Беларусі, як разгарнуўся калгасны рух. У мінулым годзе мы мелі ўсяго 994 калгасы, а ў гэтым годзе мы ўжо маем 1.713 калгасаў. Прычым, гэтым характарыстыка росту калгасаў за 1928-29 год яшчэ не канчаецца. Мы яшчэ маем значнае ўзбуйненьне існуючых калгасаў. Калі ў мінулым годзе сярэдняя плошча калгасаў раўнялася 95 гэкт., дык у гэтым годзе сярэдняя плошча калгасаў раўняецца 270 гэкт., як бачыце, больш, чым у 2 разы прайшло ўзбуйненьне калгасаў, ды плюс павялічэньне амаль у два разы іх колькасьці. Можна ўявіць, які посьпех мы маем у пытаньнях калгаснага будаўніцтва за 12 год Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Калі вы возьмеце ўдзельную вагу аграмаджанага сэктару сельскай гаспадаркі, дык яна за апошні год атрымала такія зьмены: удзельная вага пасеўнай плошчы пад калгасамі ў мінулым годзе раўнялася 1.1 проц., у гэтым годзе да восені 1929 г. удзельная вага пасеўнай плошчы пад калгасамі ў адносінах да ўсёй плошчы раўняецца 4,1 проц., а разам пад калгасамі і саўгасамі ўдзельная вага пасеўнай плошчы ў мінулым годзе складала 2,2 проц., а ў гэтым годзе — 5,3 проц., як бачыце, рост аграмаджаньня сельскай гаспадаркі, асноўнага мерапрыемства ў сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі значна вялікі ў сваім тэмпе.

Пытаньне культурнага будаўніцтва. У гэтым годзе таксама мы мелі значны размах. Я ня буду прыводзіць фактаў і лічбаў, адзначу толькі асноўнае, што зьяўляецца вялікім дасягненьнем на фронце ажыцьцяўленьня лёзунгу культурнай рэвалюцыі, — гэта тое, што мы ў 1930 г., г. зн. у бягучым гаспадарчым годзе, уводзім плян усеагульнага навучаньня па ўсёй БССР.

Таварышы, яшчэ год таму назад многія з нас ня думалі і не спадзяваліся, што мы здолеем пайсьці такім хуткім тэмпам на шляху народнай асьветы. Мы думалі, што нам прыдзецца ўвядзеньне пляну ўсеагульнага абавязковага навучаньня ажыцьцяўляць прынамсі ў канцы пяцігодкі. На справе мы маем такое становішча, што ўжо ў гэтым годзе мы прыступаем да ўвядзеньня пляну ўсеагульнага абавязковага навучаньня з такім разьлікам, што мы дзяцей ад 8—13 год павінны ахапіць першапачатковай школай на 100 проц. для таго, каб падрыхтаваць у бліжэйшы час поўнае правядзеньне пляну ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Вось асноўнае, вось важнае дасягненьне Савецкай Беларусі на фронце культурнага будаўніцтва, што становіць нас (у былым адсталую і культурна і эканамічна краіну) на адзінакавы культурны ўзровень з нашымі суседнімі савецкімі рэспублікамі — РСФСР і Украінай. Гэта мае для нас вялізарнейшае значэньне. Я ня буду гаварыць аб дасягненьнях вышэйшай асьветы, тут у нас у гэтым годзе разгортваецца такая праграма, якая зьдзіўляе ня толькі мяне, як працаўніка, які непасрэдна не працуе ў галіне народнай асьветы, а нават і саміх працаўнікоў народнай асьветы.

Я, таварышы, павінен зазначыць, што вось гэты рост народнай гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі ён магчымы быў дзякуючы таму, што мы маем вялікае падтрыманьне з боку Савецкага Саюзу, што мы маем вялікую матар'яльную дапамогу на пад'ём народнай гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі. Вось прыклад. За апошні год наш дзяржаўны бюджэт узрос на 50 з лішкам процантаў, з 65 млн. да 95 млн. У гэтым годзе мы таксама вырасьцем па дзяржаўным бюджэце ня менш, як на 40-43 проц. і наш дзяржаўны бюджэт пераваліць ужо далёка за 100 млн. руб. Ён будзе прыкладна раўняцца ня менш 135 млн. руб. (У 1924-25 гаспадарчым годзе дзяржаўны бюджэт БССР раўняўся толькі 12 млн. руб.).

Ці магчымы такі хуткі тэмп разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР без дапамогі Саюзу? Немагчымы! Толькі дзякуючы таму, што мы зьяўляемся часткаю Савецкага Саюзу, што наш плян народна - гаспадарчага будаўніцтва зьяўляецца часткаю агульна-гаспадарчага пляну Саюзу, дзякуючы таму, што мы маем з году ў год сыстэматычную грашовую датацыю і матар'яльную дапамогу, мы маем такі значны рост усёй народнай гаспадаркі.

Наша сацыялістычная рэканструкцыя і наш рост, аб чым сьведчаць лічбы, якія я абвясьціў, заключаецца ў тым, што яна праходзіць на базе матар'яльнага і культурнага ўздыму мільённых мас рабочых і бядняцка-серадняцкага сялянства. Гэта яе прынцыповае адрозьненьне ад капіталістычнай рэканструкцыі. У нас сацыялістычная рэканструкцыя і індустрыялізацыя Савецкага Саюзу, перасадка з каня на трактар, ператварэньне дзяржавы з сельска-гаспадарчай краіны ў індустрыяльную краіну адбываецца з адначасовым уздымам і ростам нацыянальных рэспублік.

Якраз процілеглая ўстаноўка ўстаноўцы капіталізму. Там эксплёатацыя капіталам калёніяльных народаў, тут усямерная дапамога Савецкага Саюзу адсталым у мінулым нацыянальным рэспублікам.

Вось што зьяўляецца асноўным, вось што зьяўляецца важнейшым пытаньнем, што абумоўлівае такі высокі тэмп нашага сацыялістычнага росту. Рост на базе агульнага ўздыму мільённай масы рабочых, мільённай масы бядняцка-серадняцкага сялянства,—гэта ёсьць рост здаровы, гэта ёсьць рост саправаўднага сацыялізму.

Такое важнае пытаньне, як рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, у нас праходзіць пановаму, пасацыялістычнаму. У нас сельская гаспадарка расьце, мэханізуецца, індустрыялізуецца не на базе арганізацыі фэрмэрска-кулацкіх гаспадарак, не на базе агаленьня і ўціску біднейшай часткі сялянства, а на базе агульнага іх эканамічнага ўздыму праз калектывізацыю. Гэта азначае, што там капіталізм арганізуе буйное земляробства шляхам вышыбаньня біднейшай часткі сялянства, мы арганізуем буйное земляробства,якое абавязкова нам патрэбна для прыстасаваньня ў сельскай гаспадарцы тэхнікі на базе эканамічнага і культурнага ўздыму сялянскай масы праз уцягненьне яе ў калектывы.

IV. Пляны загатовак і іх выкананьне

Цяпер дазвольце, таварышы, спыніцца на адным бягучым пытаньні, але надзвычайна важным з эканамічнага і палітычнага боку. Гэта пытаньне загатовак. Я тут толькі прывяду вам асноўныя лічбы. Сёлета ў загатоўках БССР адыгрывае большую ролю, чым адыгрывала ў мінулыя гады. Мы краіна такая, у якую і дагэтуль завозілі хлеб з-за мяжы БССР. Але ў гэтым годзе на нас выпала больш паважная задача— гэта павялічэньне пляну хлебазагатовак. Замест таго, што мы ў мінулым годзе загатовілі 4 млн. пудоў збожжа, у гэтым годзе мы плян загатовак вызначылі ў 7 млн. пудоў, прычым, да рэчы сказаць, мы яго ўжо цалкам выканалі, аб чым сьведчаць апошнія весткі Наркамгандлю БССР.

Апрача таго, рабочыя і сяляне БССР павінны былі правесьці адну з вялікіх палітычных і эканамічных работ — гэта загатоўка бульбы і адгрузка ў Маскву і Ленінград па нарадах цэнтру. Мы ў Савецкім Саюзе зьяўляемся загатоўчым бульбяным раёнам. Калі мы не зьяўляемся загатоўчым раёнам па збожжы, дык па бульбе зьяўляемся адным з асноўных бульбяных раёнаў. На нас была ўскладзена задача загатовіць і адгрузіць 4.5 млн. пудоў бульбы ўвосень, ды вясной адгрузіць 2 млн. пудоў. Я павінен адзначыць, што рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі гэту важнейшую задачу выканалі з найвялікшым посьпехам і сумленнасьцю, прычым у самы кароткі тэрмін. Бульба — гэта прадукт, які хутка псуецца, восень наступіла, і калі-б мы тут сапраўды не ўзьнялі энтузіязму рабочых і сялян, не разгарнулі кампаніі, мы маглі-б папсаваць бульбу, маглі-б захапіць маразы. Мы свячасова, нават да тэрміну адгрузілі бульбу, і замест таго, каб адгрузіць 4 з палов. мільёны пудоў асноўнага пляну, мы абавязаліся і прасілі, каб нам далі магчымасьць восеньню выканаць увесь гадовы плян, а гадавы плян адгрузкі з БССР раўняецца 6 з палов. млн. пудоў. Мы гэты гадавы плян адгрузкі і выканалі. Увесь плян па загатоўцы бульбы ў нас раўняецца 19 млн. пудоў, але рэшта ідзе на снабжваньне прамысловасьці, унутраное забесьпячэньне гарадоў БССР і г. д.

Загатоўчыя пляны мы ў бягучым годзе давялі да сяла, да кулацкага двара, што ў нас у мінулым годзе не праводзілася. У той час, як у іншых хлебазагатоўчых раёнах гэта ўжо праводзілася ў мінулым годзе, мы толькі ўпяршыню ў гэтым годзе ўжылі мэтад давядзеньня пляну да сяла і кулацкага двара пры правядзеньні загатовак.

Але я павінен адзначыць, што, ня гледзячы на правільныя дырэктывы, якія былі даны ЦК КП(б)Б і ўрадам па правядзеньні выразнай клясавай лініі ў пытаньнях загатовак, усё-ж такі на мясцох у радзе выпадкаў былі скрыўленьні клясавай лініі. Нам трэба будзе праверыць і выправіць тыя памылкі, якія былі дапушчаны ў гэтых адносінах.

Рабочыя БССР, гарсавет гор. Менску асабліва павінны завастрыць увагу на хутчэйшым выпраўленьні клясавых скрыўленьняў, бо вы ведаеце, таварышы, што мы маем такія паасобныя выпадкі, калі асобныя сельсаветы выканалі плян хлебазагатовак, не даводзячы да кулацка-заможных двароў, а плян, які быў даведзены да сяла, раскладалі на носе (на кожны двор): і Івану, і Сьцяпану, і Марыне, і Гаўрылу, і каму хочаш. Вядома, што ў такіх выпадках выкананьне пляну загатовак праходзіла не за кошт націску на кулака, што якраз трэба было зрабіць, а за кошт усяго сялянства, у тым ліку і беднаты.

Гэта ёсьць па сутнасьці скрыўленьне клясавай палітыкі нашай партыі, гэта ёсьць скрыўленьне ідэі, якую мы праводзілі ў арганізацыі чырвоных абозаў, дзякуючы нагалоўнай раскладцы заданьняў па хлебазагатоўках на кожны двор.

Тут-жа я павінен сказаць аб тым, што такое чырвоныя абозы. Чырвоныя абозы, як і чырвоныя эшалёны, па пытаньнях хлебазагатовак і іншых загатовак — гэта ёсьць новая і добрая форма праяўленьня ініцыятывы, асноўная на даным этапе форма арганізацыі бядняцка - серадняцкіх мас сялянства для выкананьня важных палітычных задач перад дзяржавай, для выкананьня загатовак. Гэта ёсьць форма грамадзкасьці, форма грамадзкага ўдзеўнаньня на капіталістычныя элемэнты вёскі, форма націску на кулака, гэта ёсьць форма праяўленьня грамадзкай ініцыятывы бядняцка - серадняцкага сялянства ў адносінах да сацыялістычнага будаўніцтва. У артыкуле тав. Сталіна сказана, што калгасьнікі - сяляне становяцца тварам да гораду, а я павінен сказаць, што і арганізацыя чырвоных абозаў — гэта ёсьць па сутнасьці тое, што беднякі і сераднякі, якія яшчэ не аб'ядналі ў калгасы, таксама становяцца тварам да індустрыі і забясьпечваюць яе хлебам і іншымі прадуктамі, на падставе масавай і грамадзкай арганізацыі калектыўнай здачы ліпшаў хлеба індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

V. Няўхільна праводзіць ленінскую лінію ў нацпалітыцы

Перш, чым закончыць сваю прамову, я хачу спыніцца на дасягненьнях у нацыянальнай палітыцы. Гэта пытаньне, міма якога ня можа прайсьці Менскі г

Узмацніць падрыхтоўку да зьезду і канфэрэнцый ударных брыгад

Кожны рабочы павінен ведаць задачы зьезду

Фабрычна-заводзкія канфэрэнцыі ўдарнікаў павінны быць аднэй з форм агляду ходу спаборніцтва

Выправіць памылкі

Паводле паведамленьня газэты «Віцебскі пралетары» набліжаецца час скліканьня віцебскай акруговай канфэрэнцыі ўдарных брыгад.

Весткі, якія ёсьць аб падрыхтоўцы, кажуць аб тым, што некаторыя дробныя прадпрыемствы недастаткова разумеюць важнасьць зьезду ударных брыгад.

Частка прадпрыемстваў, дзе працуе менш, чым 200 рабочых, згодна дырэктывам акрпрафбюро, не павінны выбіраць дэлегатаў на акруговую канфэрэнцыю. Гэтыя дырэктывы зразумелі так, нібы можна з меншай увагай адносіцца да **прапагандаваньня ідэй ударніцтва**, да правядзеньня справаздач аб працы ўдарных брыгад, да растлумачэньня сутнасьці і задач, якія стаяць перад акруговай канфэрэнцыяй і ўсесаюзным зьездам ударных брыгад.

Такі погляд зьяўляецца грубай памылкай. Такая практыка, калі заслухоўваюцца вынікі сацыялістычнага спаборніцтва за мінулы год, а аб ударных брыгадах гавораць мімаходам, павінна быць адкінута.

Трэба зараз-жа выправіць памылку. Ва ўсіх прадпрыемствах, якія няўважліва адносяцца да гэтай важнай справы, трэба на агульных сходах рабочых ці на зьменах, паставіць справаздачы аб працы ўдарных брыгад і пасобных ударнікаў і інфармаваць масу аб надыходзячай акруговай канфэрэнцыі ўдарных брыгад і выстаўцы сацыялістычнага спаборніцтва.

На акруговай нарадзе ўдарных брыгад

(ВОРША)

Нядаўна ў Воршы адбылася акруговая нарада ўдарных брыгад. Нарада прайшла даволі актыўна. Яна выявіла цэлы рад дасягненьняў у галіне спаборніцтва, але таксама і цэлы рад недахопаў. Перш за ўсё нарада паказала, што **не ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах у сацыялістычнае спаборніцтва былі ўцягнуты рабочыя і служачыя, а таксама інжынэрна-тэхнічны пэрсанал.** Нізавыя прафэсыянальныя арганізацыі мала клапаціліся, каб у спаборніцтва былі ўцягнуты ўсе, што працуюць на прадпрыемствах або ва ўстановах.

Да гэтага часу ў цэлым радзе прадпрыемстваў няма кантрольных лічбаў на 1929-30 год. А там, дзе гэтыя лічбы ёсьць, яны далёк канторы не пайшлі і рабочая маса аб іх ня ведае.

Слабавата праведзена выяўленьне лепшых ударнікаў і ударных брыгад. Дрэнна праводзілася прэміяваньне. Насьценгазэты мала зварачалі на гэта ўвагі і на сваіх старонках не высьвятлялі працы ўдарных брыгад і асобных ударнікаў.

Нарада вынесла рад настаноў, накіраваных на зьнішчэньне недахопаў. Такім чынам, гэта нарада зьявіла добрым рухавіком у паляпшэньні сацыялістычнага спаборніцтва і дасьць магчымасьць дабіцца новых значных дасягненьняў.

А. МІЛАШЭЎСКІ.

Дапамагаюць адсталым

(Гута «Працы», Полаччына)

У апошні час адносіны рабочых да спаборніцтва значна палепшыліся. **У цэхі, якія адставалі ў выкананьні ўзятых абавязкаў, накіраваны ўдарныя брыгады з камсамольцаў і лепшых рабочых.** Асобныя рабочыя, якія дасягнулі добрых посьпехаў і якія могуць паслужыць прыкладам для іншых рабочых, атрымалі прэміі, што зьяўляецца досьць значным штурхачом у правядзеньні сацспаборніцтва:

У выніку добрай настаноўкі сацспаборніцтва ёсьць значныя дасягненьні. Так, прадукцыйнасьць працы павялічана вышэй вытворчай праграмы на 11,7 проц. Працдысцыпліна ўзрасла і інш.

Бяз догляду і дапамогі

(ЦАЦАЧНАЯ ФАБРЫКА «АДРАДЖЭНЬНЕ», МЕНСК)

На фабрыцы арганізавана 8 ударных брыгад, у якіх прымае ўдзел каля 75-80 рабочых. Некаторыя брыгады, як і ўсе рабочыя, знаходзяцца ў досыць цяжкім становішчы. Для таго, каб даць добрыя вынікі па асноўных паказальніках вытворчасьці, ударнікі ня маюць мажлівасьці: не хапае сырцу (бляхі, жалеза). Як на недахоп, трэба паказаць яшчэ на тое, што фабрыка знаходзіцца ў стане працкалектыву, а гэта зьяўляецца прычынай таго, што на фабрыцы вельмі часта зьмяняюцца рабочыя. Такія акалічнасьці ніяк не даюць магчымасьці брыгаднікам спрацавацца.

Аднак, гэтыя брыгады маюць досыць значныя дасягненьні: прагулаў няма, якасьць прадукцыі значна палепшылася, прадукцыйнасьць працы павялічылася, павялічылася і зарплата. У скульптурным цэху прадукцыйнасьць павялічылася на 25 проц., зарплата таксама. У сьлесарным цэху зарплата брыгаднікаў павялічылася аж на 70 проц. Браку амаль што няма. У ліцейным цэху брак з 50 проц. зьменшыўся да 2-х.

Наогул ударныя брыгады зьяўляюцца ўзорам у працы іншых рабочых.

Тут-жа трэба адзначыць, што фабком ня мае дакладнага падліку дасягненьняў брыгад, ён нават ня ведае дакладна, колькі ёсьць ўсіх брыгадзіраў.

Трэба, каб фабком, вытворчая камісія, партыйная і камсамольская арганізацыі зьвярнулі на ўдарныя брыгады больш увагі.

ЦЫВЕС.

Адпіска барысаўскага райпрафбюро

Гэтымі днямі мы атрымалі адказ ад Барысаўскага райпрафбюро аб тым, што заметка, зьмешчаная ў «Зьвязьдзе» пад назваю «Рабочым нічога не вядома», не адпавядае сапраўднасьці.

Але мы ні ў якім разе ня можам пагадзіцца з такім адказам.

Чаму?

Справа ў тым, што пытаньне аб зьезьдзе ўдарных брыгад абгаворвалася, як піша старшыня райпрафбюро, але, як відаць з адказу, **толькі ў габінэтах.**

А таму сапраўды **рабочым нічога не вядома аб зьезьдзе ўдарных брыгад.** Ад фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» вылучаны 1 дэлегат на зьезд ударнікаў, але фабзаўмясцком да гэтага часу мала што зрабіў. Аб гэтым піша нават сам старшыня райпрафбюро.

Адказ старшыні райпрафбюро ёсьць ні што іншае, як бюракратычная адпіска.

Б.

Бюракраты хацелі загадам сарваць сход брыгад

(Галоўныя майстэрні Гомельскага вузла)

Кіраўнікі вучпрафсожу праверку сацспаборніцтва прабавалі правесьці габінэтным шляхам. Была вылучана часовая кантрольная камісія, якая ўсю работу ўсклала на тэхнічнага працаўніка. Натуральна, што пры такой бюракратычнай пастаноўцы, работы амаль зусім ня цікавіліся праверкай. Мясцком да гэтае кампаніі адносіўся абыяк. Усё гэта прывяло да таго, што вучпрафсожаўскія бюракраты загадам хацелі сарваць сход ударных брыгад, якія сабраліся для абгаварэньня сацспаборніцтва.

Ударныя брыгады зараз працуюць з вялікай інтэнсыўнасьцю.

В.

Праца ўдарнікаў узор для ўсіх рабочых

Работа ўдарных брыгад на прадпрыемствах у Віцебску праходзіць досыць добра. Недахопам трэба лічыць толькі тое, што не на ўсіх прадпрыемствах арганізаваны брыгады. Напрыклад, на панчошнай фабрыцы ёсьць толькі асобныя ўдарнікі (каля 29 чал.) у цэхах, ударных-жа брыгад, арганізаваных і афармленых, аж да апошняга часу няма.

З дадатных бакоў работы ўдарнікаў на панчошнай фабрыцы трэба адзначыць, што ўдарнікі вызначаюцца з усёй рабочай масы па асноўных паказальніках вытворчасьці. Так, калі па ўсім вязальным цэху прадукцыйнасьць працы была павялічана толькі на 5-6 проц., то ўдарнікі гэтага цэху прадукцыйнасьць працы паднялі да 27,7 проц. Ударнікі пачалі пераводзіць працу з 3-х шкарпэтачных машынак на 4, з 12-ці панчошных—на 14.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што ўдарнікі, хаця і неарганізаваным парадкам, але ўсё-ж могуць быць узорам у працы для іншых рабочых.

На Віцебскай шчаціннай фабрыцы створана 6 брыгад, якія ўжо зараз паказалі досыць добрыя вынікі як у павялічэньні прадукцыйнасьці працы, так і ў паляпшэньні якасьці прадукцыі.

На мэблевай фабрыцы арганізавана адна брыгада, на гарбарні—4. У працкалектыве рымароў ударнікі не арганізаваны, як і на панчошнай фабрыцы. Характэрным тут зьяўляецца тое, што ўдарнікі раскроечнага цэху падалі заяву аб добраахвотным зьніжэньні расцэнак, але адміністрацыя вельмі бюракратычна аднеслася да гэтага пытаньня і пакінула бяз вынікаў.

Па ініцыятыве ўдарнікаў у працкалектыве рымароў была праведзена досыць значная рацыяналізацыя вытворчасьці: раскройка лямцу па новым узоры, падзел працэсу работы асобных рабочых і шмат інш.

Як на недахоп у працы сярод ударнікаў, трэба паказаць на тое, што камсамольская і партыйная ячэйкі на большасьці прадпрыемстваў Віцебску слаба зьвяртаюць па гэту працу ўвагу, з прычыны чаго ва ўдарных брыгадах заўважваецца досыць невялікі процант партыйцаў.

Н.

МЕНСК

Усебеларускі зьезд прафсаюзаў

У другой палове студзеня ў Менску склікаецца ўсебеларускі зьезд прафсаюзаў. Зацьверджаны наступны парадак дня зьезду: чарговыя задачы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд, справаздача ЦСПСБ і даклад рэўкамісіі, даклад аб пяцігодцы і выніках 1928-29 гаспадарчага году, даклад Наркампрацы, даклад аб ходзе сацспаборніцтва, аб рабоце прафсаюзаў на вёсцы, аб культурна-бытавым абслугоўваньні рабочых, выбары кіруючых прафорганаў.

Модус прадстаўніцтва на зьезд—адзін дэлегат на 1000 членаў саюзу. Прадпрыемствы, якія налічваюць ад 400 да 1000 рабочых, самастойна абіраюць аднаго дэлегата, а звыш тысячы рабочых—двух дэлегатаў. У рабоце зьезду прымуць удзел каля 265 дэлегатаў.

Адкрылася менская акруговая канфэрэнцыя груп беднаты

Учора ў памяшканьні клюбу Акрвыканкому а 6 гадз. увечары адкрылася 3-я акруговая канфэрэнцыя груп беднаты Менскае акругі. Канфэрэнцыю адкрыў загадчык аддзелу па рабоце на вёсцы Менскага АК КП(б)Б т. **Тамашэўскі,** які ў кароткай прамове адзначыў дасягненьні, якія чабыты за гэты пэрыяд у галіне індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і змычкі бядняцка-серадняцкага сялянства з рабочай клясай.

Канфэрэнцыяй абраны прэзыдыум у складзе 21 чал., у ім увайшлі т.т. **Аксючыц, Славінскі, Тамашэўскі** і інш. Ад імя акруговага камітэту КП(б)Б з прывітаньнем выступіў сакратар АК т. **Славінскі.** Канфэрэнцыю віталі прадстаўнікі рабочых, швэйнай фабрыкі «Акцябр», заводу «Бальшавік», «Камунар», прадстаўнікі Чырвонай арміі.

Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б, у якой запэўняе ЦК, што беднота Менскае акругі будзе рабіць усё для таго, каб у найкарацейшы тэрмін калектывізаваць сельскую гаспадарку і што варожыя элемэнты і кулакі, якія напрабуюць перашкаджаць справе калектывізацыі, сустрэнуць з боку беднаты самы жорсткі адпор.

Пасьля прывітаньняў **з дакладам аб 5-гадовым плане разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры выступіў тав. Аксючыц.**

Прыезд камісіі маскоўскіх інжынэраў

У Менск прыехала з Масквы камісія з 5-ці інжынэраў на чале з інжынэрам Страмбуду т. Быстровым на пытаньні аб пабудове ў Беларусі першага цэмэнтнага заводу. Учора камісія разам з кіраўніком Бемстрамтрэсту т. Мар'ясіным і спэцыялістымі трэсту выехала ў Крычаў для канчатковага выбару месца пасудовы цэмэнтнага заводу і электрастанцыі.

Вайскораўскі налёт на менскія ўстановы

Учора рэдакцыяй «Зьвязды» быў арганізаваны вайскораўскі налёт на менскія ўстановы па праверцы разьмяшчэньня на работу адпускнікоў-чырвонаармейцаў.

Матар'ялы налёту будуць зьмешчаны ў бліжэйшых нумарох газэты.

Ад'езд амэрыканскай рабочай дэлегацыі

Учора раніцай амэрыканская дэлегацыя рабочых швэйнікаў выехала з Менску ў Харкаў. Перад ад'ездам дэлегацыя наведала старшыню Швэйтрэсту т. Баскіна, які даў дэлегацыі падрабязны матар'ял аб будаўніцтве швэйнай прамысловасьці ў Беларусі. Дэлегаты наведалі таксама заводы «Энэргія» і «Бальшавік», дзе азнаёміліся з вытворчасьцю і вялі гутаркі з рабочымі.

Праверка апарату прафсаюзаў БССР

Прэзыдыум ЦСПСБ устанавіў новы парадак праверкі прафсаюзнага апарату Беларусі. Пры кожным ЦК саюзу вылучаецца камісія ў складзе трох таварышоў (члена прэзыдыуму ЦП, рабочага ад варштату і пізавога актывістага) для праверкі асабістага складу працаўнікоў ЦП, на падставе матар'ялаў рабочых брыгад. Такія-ж камісіі ствараюцца пры акруговых прафбюро.

Для праверкі апарату ЦСПСБ вылучана камісія ў складзе т. **Тарасэвіча** (старшыня), **Фрыдмана і Жардэцкага** (рабочы-чыгуначнік). Гэта-ж камісія зьяўляецца цэнтральнай камісіяй па праверцы ўсяго прафсаюзнага апарату.

Праверку павінны праходзіць усе працаўнікі апарату, якія працуюць па найме (неабраныя) як апарату саюзу, так і падпарадкаваных праўленьню саюзу ўстаноў (клюб, бібліятэка, дом працы, рэдакцыйна-выдавецкі аддзел).

ЗА ДЗЕНЬ

За грубыя адносіны да наведвальнікаў. Белстрамтрэстам абвешчана суровая вымова намесьніку галоўнага бухгальтару т. **Гольдбэргу** за грубыя адносіны да наведвальнікаў.

Праверка інтэрнацыяльнай работы. Прэзыдыум ЦП саюзу будаўнікоў пачынае праверку інтэрнацыянальнай работы сярод рабочых будаўнікоў. Будуць абсьледаваны Менская, Бабруйская і Мазырская акругі. Для правядзеньня гэтай работы вылучана спэцыяльная камісія.

Пленум цэнтральнага савету Аўтадору. 18-га лістапада ў Менску склікаецца пленум цэнтральнага савету Аўтадору БССР. У парадку дня рад пытаньняў, зьвязаных з разьвіцьцём у БССР дарожнага будаўніцтва і аўтатранспарту.

БІБЛІЯТЭЧНЫ ПАХОД

17 лістапада г. г. роўна а 10 гадз. раніцы ў памяшканьні Дому Працасьветы адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД БІБЛІЯТЭЧНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ гор. МЕНСКУ.

ПАРАДАК АНЯ:

1. **Роля кнігі ў сацыялістычным будаўніцтве.**
2. **Аб бібліятэчным паходзе.**

На сход запрашаюцца прадстаўнікі ад Калгассаюзу, Белсельсаюзу, каапэрацыі, пісьменьнікі, працаўнікі Белдзяржвыдавецтва і выдавецтва РСФСР, рэдакцый газэт, перасовачнікі, кніганошы і ўсе інш. таварышы, працуючыя з кнігай

Акр. камісія па бібпаходу.

Пастанова ЦП саюзу друкароў

Заслухаўшы інфармацыю камісіі на праверцы заявы рабочых друкарні «Зьвязда» т.т. Зубаткіна, Гофмэклера, Дымэнштэйна і Вольфштэйна, ЦП саюзу друкароў Бел. адзначае, што з боку гэтых таварышоў за апошні пэрыяд былі моманты ігнараваньня фабкому і грамадзкіх арганізацый прадпрыемства, стваралася калатня, што выклікала на прадпрыемстве нездаровыя абставіны. Усё гэта прымушала фабком і грамадзкія арганізацыі прадпрыемства займацца гэтымі пытаньнямі, што адбівалася на рабоце гэткіх.

ЦП асуджае гэтых таварышоў за іх учынкі і за тое, што яны не дапамагалі грамадзкім арганізацыям ва ўсёй праводзімай рабоце.

ЦП ухваляе дзеяньні рабочага калектыву друкарні «Зьвязда», які даў адпор гэткім ненармальным зьявам, адае разам з гэтым ЦП лічыць, што пастанова калектыву аб перакіданьні гэтых таварышоў у іншыя прадпрыемствы, зьяўляецца занадта суровым мэтадам уплыву на паказаных таварышоў і ня лічыць мэтазгодным перакінуць іх на іншыя прадпрыемствы.

Разгледзеўшы ўчынак кожнага таварыша паасобку, ЦП пастанаўляе:

1. Тав. Вольфштэйну за стварэньне лаянак і калатні з т. Савіцкім і Оксенкругам на прадпрыемстве, што стварала на прадпрыемстве нездаровыя абставіны і за неўгрунтаванае распусканьне чутак аб п'янстве старшыні фабзаўмясцкому — вынесьці суровую вымову.

2. Т.т. Гофмэклеру і Дымэнштэйну за нетактычныя паводзіны на пасяджэньнях ФЗМК — вынесьці вымову.

3. Тав. Зубаткіну, б. члену ФЗК, цяперашняму члену вытворчай камісіі за тое, што замест дапамогі ФЗК, прапанаваў фабком ігнараваць (прапанаваў тав. Оксенкругу пасьля лаянкі з т. Вольфштэйнам ігнараваць і не зьвяртацца ў фабком), чым падрываў работу ФЗМК—вынесьці вымову.

4. ЦП адзначае, што фабком несвачасова рэагаваў на гэтыя зьявы і ня прымаў своячасовых захадаў выхаваўчага характару да гэтых таварышоў, — ва што паставіць фабкому на від.

5. У бліжэйшы час заслухаць даклады ФЗМК і адміністрацыі друкарні «Зьвязды» аб стане гаспадарчай і прафэсыянальнай работы на прадпрыемстве.

ЦП заклікае калектыў рабочых і служачых друкарні «Зьвязды» дружна ўзяцца за работу па разгортваньні сацспаборніцтва, за датэрміновае выкананьне пяцігодкі, за разгортваньне самакрытыкі на прадпрыемстве і за актыўны ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах, намячаемых кампартыяй і савецкай уладай.

Другая раённая электрастанцыя ў БССР

Кошт будаўніцтва—25 млн. руб.

СНК БССР згадзіўся з прапановай ВСНГ і Гомельскага АВК аб пабудове другой раённай электрастанцыі ў раёне вёсак Волатава, Гомольскай акругі. СНК прызнаў, што станцыя павінна ў першую чаргу абслугоўваць гарады Гомель, Рэчыцу, Жлобін, Рагачэў, Лоеў і Добруш, а вызначаны арыентовачна ў 25 млн. руб. таксама гарады Злынка, Новазыбкаў і Клінцы за межамі БССР.

Магутнасьць другой раённай электрастанцыі на першы пачатак устаноўлена ў 36 тысяч кілёват. Кошт будаўніцтва ў 25 млн. руб.

Перавыбары саветаў у БССР

ПАСКОРЫЦЬ РАЗГЛЯД СПРАЎ ПАЗБАЎЛЕНЫХ

У сувязі з надыходзячай перавыбарчай кампаніяй прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў рад канкрэтных прапаноў аб упарадкаваньні і паскарэньні разгляду скаргаў на пазбаўленьне выбарчых праў.

Усім выбарчым камісіям прапачавана на працягу месяца закончыць разгляд усіх паступіўшых да гэтага часу скаргаў на няправільнае пазбаўленьне выбарчых праў.

Раённыя, акруговыя і цэнтральная выбарчая камісіі павінны прымаць да разгляду толькі тыя справы, якія будуць разгледжаны ў гэтую перавыбарчую кампанію непасрэдна падпарадкаванымі ім выбарчымі камісіямі.

Такім чынам, усе пазбаўленыя выбарчых праў, незалежна ад таго, дзе даўгетуль разглядаліся іх справы, могуць падаваць заявы ў свае мясцовыя выбарчыя камісіі і ўжо толькі пасьля разгляду там гэтых спраў зварочвацца ў вышэйшыя выбарчыя камісіі.

Гэта дасьць магчымасьць мясцовым выбарчым камісіям, якія бліжэй стаяць да асоб, што скардзяцца, яшчэ раз праверыць правільнасьць пазбаўленьня выбарчых праў.

Як правіла, паўторны разгляд скаргаў у цэнтральнай выбарчай камісіі і прэзыдыуме ЦВК можа адбывацца не раней, як праз год. Выключэньне дапускаецца толькі ў тых выпадках, калі выявіліся новыя акалічнасьці, або калі аб гэтым хадайнічаюць прафэсыянальныя і грамадзкія арганізацыі.

Ліст у рэдакцыю

Паважаны тав. Рэдактар!

Не адмоўце зьмясьціць у вашай газэце наступны ліст:

Пачынаючы з 2-XI паступаюць масавыя скаргі ад калектываў і асобных падпісчыкаў на неатрыманьне і неакуратную дастаўку газэт і часопісяў па падпісцы, зданай раней Беларускаму аддзяленьню цэнтральных выдавецтваў, якое зараз ліквідавана, і па падпісцы на лістапад месяц, зданай ранава арганізаванаму Беларускаму аддзяленьню выдавецтва ЦК УсеКП(б) «Правда».

Асобныя падпісчыкі і калектывы абвінавачваюць у гэтым аддзяленьне.

Лічу сваім абавязкам праз беларускі друк давесьці да ведама ўсіх падпісчыкаў г. **Менску,** якія здалі падпіску як былому аддзяленьню цэнтральных выдавецтваў, так і падпісчыкаў, што падпісаліся на лістапад у нанова арганізаваным аддзяленьні «Правда», што ў непаразуменьнях у частцы дастаўкі пэрыядычнага друку вінавата выключна пошта.

У сувязі з пераходам газэт «Правда» і «Известия» на бесьперапынны выпуск і ў сувязі з ростам тыражу ўсіх выданьняў наогул, Менская пошта разам з газэтным бюро несваячасова і недастаткова падрыхтавалася да рэарганізацыі свайго апарату дастаўкі, з прычыны чаго гэты апарат аказаўся непрыстасаваным да штодзённага бесьперабойнага абслугоўваньня падпісчыкаў.

Такое-ж самае становішча мы маем і ў іншых гарадох БССР.

Толькі 4-XI адбылася нарада Менскай пошты з удзелам загаснту і загадчыкаў аддзеламі, дзе абгаворвалася пытаньне аб ненармальным становішчы з дастаўкай у Менску газэт, і быў прыняты новы варыянт, які, мы думаем, гэта пытаньне ўрэгулюе.

5-XI усе сілы аддзелу дастаўкі і газэтнага бюро былі кінуты на разьбіўку гораду на новыя вучасткі і саргаваньне картак.

Пачынаючы з 9-XI паплыў скаргаў як ад асобных падпісчыкаў, так і ад калектываў трохі зьменшыўся. Трэба думаць, што новы варыянт дастаўкі выданьняў (калі Менская пошта да пытаньня дастаўкі ня будзе падыходзіць чыста камэрцыйна і дасьць належную колькасьць разносчыкаў) дасьць магчымасьць зжыць тое хаатычнае становішча з дастаўкаю на позьніе, якое мела месца ў першых лічбах лістапада месяца.

Адначасова я зьвяртаюся да ўсіх калектываў і індывідуальных падпісчыкаў, якія падпісаліся на выданьні ЦК УсеКП(б) «Правда». аб усіх ненармальнасьцях дастаўкі паведамляць свае часова і непасрэдна ў аддзяленьне—Менск, Савецкая 61, тэл. 8-21, бо усякая спозьненая скарга падпісчыка не наладжвае работы пошты ў частцы дастаўкі выданьняў, а наадварот патурае далейшым ненармальнасьцям.

РСІ яшчэ раз патрэбна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на работу пошты ў частцы дастаўкі выданьняў як у Менску, так і ў іншым гарадох БССР.

З камуністычным прывітаньнем

Загадчык Бел. Аддзяленьнем Выд. ЦК УсеКП(б) «Правда» БАБРОЎСКІ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

— Менапругном МОПР'у паведамляе, што сёньня, 16 лістапада, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьне АК МОПР'у адбудзецца **2-ая лекцыя на курсах** нізавога мопраўскага актыву, на тэму: **«Арганізацыйная работа ячэйкі».**

Просьба да ўсіх курсантаў зьявіцца без спазьненьня. Пасьля заняткаў праводзіцца экскурсія ў музэй «Катаргі і ссылкі».

Запрашаецца гарадзкі мопраўскі актыў.

— 17-га лістапада, а 7 гадз. увечары ў зал пасяджэньняў АК КП(б)Б адбудзецца нарада сакратароў ячэек КП(б)Б, старшынь фабзаўмясцкомаў (членаў партыі), кіраўнікоў савецкіх каапэрацыйных і інш. устаноў (членаў партыі) па пытаньні правядзеньня кампаніі па заключэньні калдагавароў саюзу саўгандальслужачых.

У нядзелю, 17-га лістапада, а 9 гадзіне раніцы ў АПАД ЦК КП(б)Б адбудзецца аб'яднанае пасяджэньне праўленьня марксыцкіх таварыстваў БССР.

Абавязкова павінны прысутнічаць наступныя т.т.: Выдра, Саевіч, Вальфсон, Лур'е, Пікус, Стракоўскі, Рыўлін, Сэрбэнта і Ігнатоўскі.

Дом Камасьветы. У нядзелю, 17-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ў Доме Камасьветы імя Карла Маркса адбудзецца вечар партыйнага, камсамольскага і беспартыйнага актыву. Тав. Стракоўскі зробіць даклад на тэму: «5-гадовы плян індустрыялізацыі БССР і задачы сацспаборніцтва». Пасьля дакладу—мастацкае аддзяленьне.

Дом Камасьветы. 19-га лістапада, а 8-й гадз. увечары—лекцыя т. **Слоніма** на тэму «Тэорыя арганізаванага капіталізму» для членаў КП(б)Б, ЛКСМ і слухачоў сеткі партасьветы. Пасьля—мастацкае аддзяленьне.

Уваход па білетах, разасланых у ячэйкі і па партбілетах.

Пэдгабінэт. У панядзелак, 18-га лістапада, Дом Асьветы сумесна з пэдгабінэтам наладжвае лекцыю на тэму «Палітэхнічная адукацыя ў пэрыяд дыктатуры пралетарыяту». Лекцыю прачытае т. **Панкевіч.** Пачатак а 7-й гадз. Уваход вольны.

У аўторак, 19-га лістапада, у Доме Асьветы—канфэрэнцыя выкладчыкаў грамадазнаўства школ г. Менску. Пачатак а 6-й гадз. увечары. Яўка настаўнікаў абавязкова.

Дом Асьветы. 17 лістапада, а 6-й гадз. увеч.—пасяджэньне праўленьня Дому. Палітгурток дашкольніц—а 7-й гадз. увеч.

Клюб саўгандальслужачых. Члены клюбу і саюзу саўгандальслужачых запрашаюцца прыняць удзел у рэцэнзэнцкім гуртку пры клюбе саўгандальслужачых. Запіс—у праўленьні і бібліятэцы клюбу ад 6 да 10 гадз. увечары.

БДУ. У актавай залі БДУ, 16-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары—адкрыты сход парткалектыву БДУ. Яўка членаў і кандыдатаў КП(б)Б абавязкова.

Дом асьветы. 16-га лістапада, а 7-й гадз. увечары адбудзецца адкрыты агульны сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы з наступнай абвесткай дня: Даклад аб карэньнях і правах нацыянал-дэмакратызму і бягучыя справы.

Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску.

БДУ. 18-га лістапада, а 7-й гадз. увеч. у актавай залі адбудзецца першы сход па чыстцы ячэйкі КП(б)Б пэдфаку. Яўка ўсіх партыйцаў і камсамольцаў абавязкова і без спазьненьня. Запрашаецца ўсё беспартыйнае студэнцтва, навуковыя і тэхнічаўнікі, рабочыя 1МК, МБВ чыг., рабочыя унівэрсытэцкага гарадка і рабочыя «Чырвонай Зоркі». Партыйцы, якія выехалі з Менску, не праходзілі чысткі і лічацца на вучоце ячэйкі КП(б)Б пэдфаку, зьяўляюцца з 21-га лістапада па 1-е сьнежня і праходзяць чыстку ў пазачарговым парадку.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Рабочыя швэйнай фабрыкі „Кастрычнік" узялі шэфства над Наркамгандлем

Органы РСІ павінны дапамагчы рабочай ініцыятыве

У газэце «Зьвязда» ўжо паведамлялася аб тым, што рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» першымі адгукнуліся на заклік рабочых маскоўскага электразаводу і прынялі шэфства над Наркамгандлем і Белдзяржгандлем. Швэйнікі ў сваю чаргу выклікалі пасьледваць іх прыкладу заводы «Камунар», «Бальшавік» і чыгуначныя майстэрні.

Якія задачы ставяць перад сабой рабочыя швэйнай фабрыкі?

Шэфы павінны выявіць выпадкі бюракратызму і цяганіны, змагацца з імі праз удзел у рабоце эканомкамісіі ўстановы, вывучыць структуру і работу Наркамгандлю, прымаць актыўны ўдзел у чыстцы апарату, падрыхтоўваць рабочых для вылучэньня ў апарат наркамату.

Для таго, каб выканаць гэтыя задачы, рабочыя разьмеркавалі аддзелы і інспэктуры Наркамгандлю паміж 4-мя цэхавымі прафбюро фабрыкі. Кожнае цэхпрафбюро, якое аб'ядноае 300—400 рабочых, вылучае рабочую брыгаду з 15—20 чалавек, якая прымацоўваецца да адпаведнага аддзелу Наркамгандлю.

Рабочыя брыгадзіры зьяўляюцца асноўным рабочым актывам Наркамгандлю, які павінен азнаёміцца з усёй работай наркамату, прымаць удзел ў працы аддзелаў, выконваць асобныя заданьні.

Швэйнікі вылучылі 7 рабочых у якасьці штатных памочнікаў інспэктароў Наркамгандлю. Гэта работа будзе выконвацца ў нерабочы час, пры чым вылучаныя рабочыя вызваляюцца ад усякай грамадзкай і партыйнай нагрузкі на фабрыцы.

За лік вылучаных рабочых павінна праводзіцца пралетарызацыя апарату Наркамгандлю.

Ініцыятыву рабочых фабрыкі «Кастрычнік» павінна падтрымаць уся рабочая грамадзкасьць БССР.

Гр. Шпэктароў.

Вопыт, які сябе цалком апраўдаў

Партыя паставіла асноўнай умовай чысткі савецкага апарату—шырокі ўдзел рабочых у гэтай важнейшай задачы.

Як ажыцьцяўляўся гэты удзел?

У пачатку практыкавалася перанясеньне сходаў па чыстцы апарату з муроў установы на прадпрыемства. Нажаль, гэта форма ўдзелу рабочых не дала належных вынікаў. Рабочыя дрэнна ведалі ўмовы і работу данай установы і вельмі слаба ўдзельнічалі ў чыстцы.

Рабочыя **Маскоўскага Электразаводу** высунулі новую форму ўдзелу рабочых у чыстцы апарату, якая павінна даць рэальныя вынікі. Гэта форма—**шэфства прадпрыемства над установай.** Рабочыя Электразаводу ўзялі шэфства над Наркамфінам. Першыя-ж тыдні работы шэфаў паказалі, што гэтае мерапрыемства не зьяўляецца парадным дэкларацыяй, а заслугоўвае самай сур'ёзнай увагі.

Як ажыцьцяўлялася шэфства? Рабочыя Электразаводу вылучылі спэцыяльную брыгаду, якая дапамагала камісіі РСІ чысьціць Наркамфін. Рабочая брыгада не абмежавалася парадным удзелам на сходах, яна ўважліва і дасканала вывучала работу апарату, яго асабісты склад, памылкі і недахопы апарату.

Шэфства рабочых Электразаводу, як форма штодзённага практычнага ўдзелу рабочых у чыстцы апарату і сталага кантролю над ім, зусім апраўдала сябе.

Ініцыятыва рабочых дала магчымасьць стварыць новую, вельмі каштоўную форму масавага рабочага кантролю за правільнасьцю клясавай лініі савецкага апарату.

У сваім дакладзе на V-м пленуме ЦКК УсеКП(б) т. **Арджанікідзе адзначыў,** што ў асобе рабочых брыгад, якія шэфствуюць над дзяржапаратам, РСІ атрымала без усялякіх дэкрэтаў тыя групы садзейнічаньня РСІ, аб якіх у свой час часта гаварыў т. **Ленін,** калі падкрэсьліваў неабходнасьць прыцягненьня рабочых да кіраўніцтва дзяржавай.

Тав. **Арджанікідзе** падкрэсьліў, што калі органам ЦКК-РСІ удасца зачапіцца за гэтыя шэфскія брыгады і кіраваць іх работай, калі на кожным заводзе будуць створаны брыгады РСІ, то органы рабоча-сялянскай інспэкцыі атрымаюць дзесяткі тысяч лепшых памочнікаў у барацьбе з бюракратызмам і безгаспадарчасьцю.

У БССР першымі прынялі выклік рабочых электразаводу рабочыя швэйнай фабрыкі «Кастрычнік».

Іх ініцыятыва павінна сустрэць самае шырокае падтрыманьне ўсёй КП(б)Б, усіх кіруючых органаў.

Органы РСІ павінны хутчэй узяць на сябе кіраўніцтва шэфствам рабочых, памятуючы, што гэта шэфства зьяўляецца адным з важнейшых відаў масавай барацьбы з бюракратызмам, зьяўляецца масавай школай дзяржаўнага кіраўніцтва.

Тыраж першай пазыкі індустрыялізацыі ў Віцебску

20-га лістапада ў Віцебску адбудзецца 9-ты тыраж першай пазыкі індустрыялізацыі. Цэнтральная камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту пастанавіла прасіць ЦВК БССР выдзеліць групу членаў сэсіі ЦВК—рабочых і сялян для ўдзелу ў рабоце тыражнай камісіі. Тыраж працягнецца 3-4 дні.

ТЭАТР і КІНО

ДОМ АСЬВЕТЫ — Сёньня 16 лістапада: 1) Канцэрт Дзярж. Вандраутр. Тэатру — пад кіраўніцтвам — У. ГАЛУБКА, 2) Кіно „Ночны рамізьнік". Пачатак 1 сэансу а 6 г. 30 м., 2—9 г. 30 м. Білеты ў касе Дому ад 5 г. увеч.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР — Ш. Дауганольскі. СУБОТА, 16-га лістапада адкрыты спэктакль. Білеты ў рабкасе і ў касе тэатру. НЯДЗЕЛЯ, 17-га лістапада для саюзу мэталістых. Білеты ў саюзе. Паядынак машын. Пачатак спэктакляў роўна а 8 з пал. гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА — Буйны мастацкі фільм па славутым рамане Ф. ГЛАДКОВА ЦЭМЭНТ. Зьвыш праграмы Першы год пяцігодкі. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО ПРАЛЕТАРЫЯНА — Амэрыканскі фільм НЕБАСКРОБ. драма ў 6 частках. Зьвыш праграмы хроніка „Совкино" № 60

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — Новы фільм вытворч. „Совкино" з жыцьця вандроўных цыркачоў АПОШНІ АТРАКЦЫЁН. драма ў 6 частках. Зьвыш праграмы кіно-хроніка „Совкино" № 62. Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-ны дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр" — Выдатны фільм ВАСЯ РЭФАРМАТАР у 6 частках. Каса адчынена